Родная газета на роднай мове
ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
19 ЖНІЎНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 159 (28269)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Аўгустоўскі канал запрашае

СТАР. 3



## Разыначкі родных кутоў

СТАР. 13



## Праграма тэлебачання на тыдзень

**20 КАНАЛАЎ**

### *ЦЫТАТА ДНЯ*



**Лілія АНАНІЧ, міністр інфармацыі:**

*«Сустрэчы ў працоўных калектывах паказваюць, што нашы грамадзяне неабыякавыя да таго, хто прыйдзе ў парламент і будзе прадстаўляць інтарэсы іх рэгіёну. Больш за тое, яны выказваюць сваё разуменне далейшага развіцця эканомікі і звяраюць з праграмай кандыдатаў у дэпутаты. Падобная актыўнасць дае ўпэўненасць, што выбарчая кампанія будзе паспяховай».*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 25° |
| Віцебск | + 22° |
| Гомель | + 23° |
| Гродна | + 23° |
| Магілёў | + 21° |
| Мінск | + 23° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.08.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9288 | ▼ |
| Еўра | 2,1832 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0306 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0765 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# ДРЭВА ВЕРНАСЦІ



**Гэтае незвычайнае дрэва расце ў вёсцы Любонічы Кіраўскага раёна. Жыхары вёскі называюць дрэва «Іван ды Мар'я» — па імёнах гаспадароў дома Івана і Марыі Салановічаў.**

**Насамрэч, гэта два дрэвы — рабіна і клён, якія абвіліся адно вакол другога. Трыццаць пяць гадоў таму дрэвы пасадзілі гаспадары, калі набылі гэты дом і азелянялі прылеглую тэрыторыю. Каб дрэвы не паламалі, іх пасадзілі блізенька. З часам тонкая рабіна і клёнік ужо нагадвалі сімвал вернасці і былі як адно цэлае.**

**У вернасці і павазе адзін да аднаго жывуць і Іван Адамавіч з Марыяй Іванаўнай, простыя і працавітыя людзі. Сёлета іх шлюбу споўнілася 60 гадоў.**

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

■ Жыллё

# ХВАЛЯ ШТУЧНАГА ГАТУНКУ

### Сенсацыйнае падаражанне другаснага жылля ў сталіцы аказалася рэкламнай бурбалкай? А эксперты-практыкі прагназуюць выключна плаўнае патанненне

**Літаральна ў першай палове жніўня асобныя СМІ пачалі выдаваць у эфір інфармацыю пра тое, што ўпершыню за апошнія некалькі гадоў жыллёвы рынак Мінска ажыццявіў разварот тэндэнцый і кватэры пачалі даражэць.**

**Падчас даволі складанай эканамічнай сітуацыі ў нашым рэгіёне падобная навіна нагадвае нейкі рэкламны трук.**

**Каб прафесійна ацаніць сітуацыю на мінскім рынку жылля і скласці прагноз на бліжэйшыя 4-5 месяцаў, карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з вядомым экспертам у сферы жыллёвай нерухомасці — старшынёй савета Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалаем ПРАСТАЛУПАВЫМ.**

### Часовае «вымыванне» танных аднапакаёвак

Справа ў тым, што менавіта ў ліпені сур'ёзна актывізаваліся пакупнікі бюджэтнага жылля, якія даволі хутка разабралі амаль усе танныя аднапакаёвыя і маленькія двухпакаёвыя кватэры. А паводле інфармацыі нашага аналітыка, у гэты час новага таннага жылля на рынак паступала даволі мала. У жніўні ўвогуле новыя варыянты любых тыпаў кватэр з'яўляюцца рэдка.

Сёлета спрацаваў і яшчэ адзін фактар. Вядома, што на сталічным рынку каля 80% прадаўцоў жылля з'яўляюцца адначасова і патэнцыйнымі пакупнікамі. Гэта калі ўласнікі маленькага жылля пасля павелічэння сям'і вырашаюць прадаць сваю аднапакаёўку і набыць з даплатай двухпакаёвую ці трохпакаёвую кватэру. Гэтым летам высветлілася, што частка падобных прадаўцоў вырашыла адкласці продаж сваіх аднапакаёвых кватэр, бо ў іх не хапае грошай на даплату. Таму адразу і прапанова маленькіх па плошчы кватэр паменшылася.

СТАР. 4

■ Армія

# МІРНАЕ НЕБА АБАРОНІЦЬ... «ПРАЦІЎНІК»

**Беларускія вайскоўцы прынялі на ўзбраенне радыёлакацыйную станцыю далёкага выяўлення новага пакалення.**



Фота Надзеі БУЖАН.

У невялікім ваенным фургоне знаходзяцца некалькі салдат. На ўсталяваным тут вялікім маніторы адлюстроўваюцца загадкавыя для недасведчанага чалавека стрэлкі і лічбы. Гэта паветраная прастора над краінай, а знакі — аб'екты, што перамяшчаюцца ў ёй. Кожны з іх лёгка ідэнтыфікуецца, камп'ютар вызначае хуткасць, траекторыю і іншыя параметры. Усё гэта робіць новая радыёлакацыйная станцыя «Праціўнік», якая днямі паступіла на ўзбраенне нашай арміі.

— Наша задача — стварыць мабільныя, добра аснашчаныя Узброеныя сілы, гатовыя аператыўна і адэкватна рэагаваць на любыя патэнцыйныя пагрозы, — адзначыў падчас перадачы РЛС **начальнік Генеральнага штаба Узброеных сіл — першы намеснік міністра абароны, генерал-маёр Алег БЕЛАКОНЕЎ.** — Сёння знамянальны дзень. Армія працягвае папаўняцца найноўшай тэхнікай і ўзбраеннем. У радыётэхнічныя войскі ваенна-паветраных сіл і супрацьпаветранай абароны перадаецца сучасная радыёлакацыйная станцыя сярэдніх і вялікіх вышыняў «Праціўнік».

СТАР. 2

# УЗАЕМНАЯ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ У СТРАТЭГІЧНЫМ ПАРТНЁРСТВЕ

**Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу з членам Палітбюро Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Кітая, сакратаром палітыка-юрыдычнай камісіі ЦК КПК Мэн Цзяньчжу. Кітайская дэлегацыя на чале з Мэн Цзяньчжу прыбыла ў Мінск для ўдзелу ў другім пасяджэнні беларуска-кітайскага міжурадавага камітэта па супрацоўніцтве.**

У Беларусі ўважліва назіраюць за ростам міжнароднага аўтарытэту КНР, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, выказаўшы ўпэўненасць, што Кітай на саміце «Вялікай дваццаткі», які пройдзе ў верасні ў кітайскім горадзе Ханчжоу, прапануе свой погляд на вырашэнне праблем у сусветнай эканоміці і палітыцы.

Прэзідэнт таксама адзначыў, што чакае сустрэчы са Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам і традыцыйна шчырага абмену думкамі падчас свайго дзяржаўнага візіту ў КНР, які плануецца на канец верасня. Візіт мусіць вывесці беларуска-кітайскае супрацоўніцтва на новы, яшчэ больш высокі ўзровень.

«За 25 гадоў з моманту ўстанаўлення дыпламатычных адносін Беларусь і Кітай зрабілі вельмі шмат для ўмацавання двухбаковых сувязяў, — перакананы беларускі лідар. — У нашым дыялогу абсалютна няма закрытых тэм і нявырашаных праблем». У ходзе перамоў узаемным было меркаванне аб неабходнасці яшчэ больш актывізаваць міжрэгіянальныя кантакты (многія з якіх былі наладжаны ў ходзе праведзенага ў маі мінулага года беларуска-кітайскага бізнес-форуму) як аснову гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, якое павінна дасягнуць такога ж высокага ўзроўню, як і палітычнае. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы выказаў меркаванне, што тэхналагічныя і інвестыцыйныя сувязі павінны стаць прыярытэтнымі ва ўсім комплексе маштабнага беларуска-кітайскага ўзаемадзеяння.

У сваю чаргу Мэн Цзяньчжу адзначыў усеабдымны характар супрацоўніцтва з Беларуссю. Ён канстатаваў высокі ўзровень палітычнага ўзаемадаверу і ўзаемную падтрымку на буйных міжнародных мерапрыемствах.

Член Палітбюро ЦК КПК таксама высока ацаніў ролю беларускага лідара ў развіцці беларуска-кітайскага супрацоўніцтва, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Ён падкрэсліў, што Кітай разглядае маючы адбыцца візіт Прэзідэнта Беларусі ў Пекін як найважнейшую падзею ў беларуска-кітайскіх адносінах у бягучым годзе. Цяперашняя прадстаўнічая кітайская дэлегацыя ў тым ліку прапрацоўвае пытанні падрыхтоўкі візіту беларускага лідара ў Кітай.

■ Выбары-2016

# Сустрэчы з назіральнікамі — традыцыйныя для МЗС

**На гэта звярнуў увагу Дзмітрый МІРОНЧЫК, начальнік галоўнага ўпраўлення інфармацыі і прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў, адказваючы на пытанне карэспандэнта «Звязды».**

Так, на мінулым тыдні ў знешнепалітычным ведамстве адбылася сустрэча з членамі папярэдняй місіі Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы па назіранні за выбарамі ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. А ў мінулы панядзелак намеснік міністра замежных спраў нашай краіны Яўген Шастакоў сустрэўся са спецыяльным каардынатарам місіі кароткатэрміновых назіральнікаў Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ) на выбарах у Палату прадстаўнікоў, намеснікам Старшыні Парламенцкай асамблеі АБСЕ Кентам Харстэдам. Пра што ішла гутарка на гэтых сустрэчах?

— Гэта стандартная форма нашага супрацоўніцтва з місіямі міжнародных назіральнікаў, якія прыязджаюць у Беларусь, каб узяць удзел у назіранні за парламенцкімі ці прэзідэнцкімі выбарамі, — патлумачыў Дзмітрый Міронччык. — Нагадаю, што такія місіі, як місія Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, а таксама місія назіральнікаў ад Садружнасці Незалежных Дзяржаў, прыязджаюць у Беларусь па запрашэнні Міністэрства замежных спраў. Сустрэчы ў знешнепалітычным ведамстве — гэта цалкам натуральная частка іх работы ў Беларусі. Што тычыцца місій назіральнікаў, якія прадстаўляюць міжнародныя парламенцкія структуры, з імі мы таксама традыцыйна сустракаемся, абмяркоўваем агульныя пытанні работы гэтых місій у Беларусі, а таксама ўсе іншыя пытанні, якія ўяўляюць цікавасць для бакоў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

ПРАМАЯ ЛІНІЯ

## Сацыяльныя гарантыі дзяржавы

Якія віды сацыяльнай дапамогі гарантуюцца дзяржавай і хто мае права на іх атрыманне? Куды звяртацца ў выпадку цяжкай жыццёвай сітуацыі? На якую падтрымку могуць разлічваць сем'і з дзецьмі? На якія формы сацыяльнага абслугоўвання варта звярнуць увагу пенсіянерам? Гэтыя і іншыя пытанні вы зможаце задаць на «прамой лініі» госцю нашай рэдакцыі — **галоўнаму спецыялісту аддзела адраснай сацыяльнай дапамогі і сацыяльнага абслугоўвання ўпраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяне Мікалаеўне ТАЛАЛАЕВАЙ.**

Тэлефануйце **23 жніўня з 11 да 12 гадзін па нумары 8 (017) 287-18-71.**

Папярэднія пытанні можаце задаць 23 жніўня па тым жа тэлефоне з 9 да 11 гадзін або даслаць (з пазнакай «Прамая лінія») на электронны адрас info@zviazda.by ці па пошце: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

■ Знешняя палітыка

# Комплекс будынкаў нашага пасольства адкрыецца ва Украіне

**Начальнік упраўлення інфармацыі, прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Дзмітрый Міронччык паведаміў пра тое, што ў хуткім часе будзе гатовы для ўрачыстага адкрыцця комплекс будынкаў Пасольства Рэспублікі Беларусь ва Украіне.**

— Гэта падзея з'яўляецца чарговым практычным крокам па рэалізацыі Пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Кабінетам Міністраў Украіны аб умовах размяшчэння і абслугоўвання дыпламатычных прадстаўніцтваў Рэспублікі Беларусь ва Украіне і Украіны ў Рэспубліцы Беларусь ад 15 снежня 2000 года, — паведаміў Дзмітрый Міронччык.

Згодна з Пагадненнем, беларускаму боку на парытэтнай аснове быў выдзелены ўчастак 0,25 га ў Саломенскім раёне Кіева пад будаўніцтва комплексу будынкаў, які ўключае рэзідэнцыю пасла, жылы дом для беларускіх дыпламатаў і супрацоўнікаў пасольства, падземны паркінг на 20 машына-месцаў, гасцявую аўтастаянку, а таксама пляцоўкі для адпачынку дзяцей і дарослых. Агульная плошча памяшканняў складае 3762 квадратных метраў. Як паведаміў прадстаўнік дыпламатычнага ведамства, падчас будаўніцтва выкарыстаны сучасныя тэхналогіі, а таксама найноўшыя эколага-эканамічныя сістэмы і сістэмы бяспекі.

— Увядзенне ў эксплуатацыю комплексу будынкаў Пасольства Рэспублікі Беларусь ва Украіне адпавядае стратэгіі развіцця сеткі беларускіх дыпламатычных прадстаўніцтваў за мяжой, — адзначыў прэс-сакратар МЗС. — Наяўнасць у Беларусі такой замежнай уласнасці дазволіць сэканоміць на арэндзе жылых памяшканняў для супрацоўнікаў дыпламатычных місій, забяспечыць высокі ўзровень бяспекі беларускіх дыпламатаў і членаў іх сем'яў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# Засталіся няжатымі 10% плошчаў

**У краіне засталося ўбраць ураджай з крыху больш за 10% пасяўных плошчаў. Па аператыўнай інфармацыі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, у Беларусі на 18 жніўня ўбрана больш за 6,4 млн тон збожжа. Пры гэтым сярэдняя ўраджайнасць дасягнула 34,1 ц/га.**




Завяршаюць уборку гаспадаркі Мінскай вобласці, дзе ўбрана 1,68 млн тонаў збожжа з 95% плошчаў. Намалот збожжа ў Брэсцкай вобласці склаў больш за 1,15 млн тон. На Гродзеншчыне і Гомельшчыне сабрана 1059 і 1052,3 тысячы тон адпаведна. Менш за мільён сабралі гаспадаркі Магілёўскай вобласці — там намалот збожжа склаў 898,8 тысячы тон. У Віцебскай вобласці зерне ўбрана яшчэ толькі з 59,3% пасяўных плошчаў, а агульны намалот збожжавых і зернебабовых культур склаў 572,4 тысячы тон.

Варта адзначыць, што ўсе камбайнеры-тысячнікі Талачынскага раёна Віцебскай вобласці вядуць жніво без паможнікаў. Так, па інфармацыі абкама прафсаюза работнікаў АПК, 9 камбайнераў Талачынскага раёна ўжо пераўзышлі тысячны рубеж па зборы збожжа. Ураджайнасць збожжавых культур на палях Талачынскага кансервавага завода складае 39 ц/га пры сярэдняй па раёне 29,1 ц/га. Хлебаробы прадпрыемства ўжо ўбралі больш за 90% плошчаў. У цэлым у рэгіёне тысячны намалот пераўзышлі больш за 30 экіпажаў збожжаўборачных камбайнаў. Вынік у 2 тысячы тон пакуль мае толькі адзін «дуэт» старшага камбайнера Мікалая Захаранкі і камбайнера Сяргея Каткоўскага з СВК «Ларынаўка» Аршанскага раёна. У гэтай гаспадарцы жніво ўжо завершана.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

# МІРНАЕ НЕБА АБАРОНІЦЬ... «ПРАЦІЎНІК»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Гэта першая з серыі новых станцый, якія павінны паступіць на ўзбраенне нашых падраздзяленняў. РЛС пастаўляецца па лініі ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва з Расійскай Федэрацыяй. Па сукупнасці параметраў яна значна пераўзыходзіць усе існуючыя аналагі.


Фота Надзеі БУЖАН.

Новы тып станцыі значна павялічыць баявыя здольнасці радыётэхнічных войскаў. Толькі адзін факт для прыкладу: калі старая РЛС мае ў сваім складзе восем прычэпаў і паўпрычэпаў і разгортваецца да 19 гадзін, то новая ўсяго тры прычэпы і час яе разгортвання — прыкладна 30 хвілін. Менавіта на высокую мабільнасць часцей робіцца стаўка ў Міністэрстве абароны. Ураджваюць і асноўныя тэхнічныя характарыстыкі «Праціўніка». Станцыя можа суправаджаць адначасова да 200 цэляў на вышыні да 150 кіламетраў. Радыус дзеяння — 450 кіламетраў. Аўтаматыка можа распазнаваць восем класаў цэляў: сучасныя бамбардзіроўшчыкі і знішчальнікі, крылатыя ракеты, а таксама перспектыўныя лятальныя апараты, напрыклад, гіпергукавыя самалёты.

Свае высокія характарыстыкі сістэма ўжо пацвердзіла падчас выпрабаванняў рэактыўнай сістэмы залпавага агню «Паланэз» у чэрвені. РЛС своечасова выявіла балістычныя ракетныя пускі, вызначыла траекторыю ракет і суправаджала цэлі падчас іх палёту на хуткасці больш за 4 тысячы кіламетраў за гадзіну. Максімальная хуткасць цэлі, якую можа «бачыць» станцыя — неверагодныя 8 тысяч кіламетраў за гадзіну. «Праціўнік» можа працаваць у звязцы з усімі існуючымі тыпамі супрацьракетнага ўзбраення беларускай арміі, а таксама пры цэлеўказанні для авіяцыі.

— Сёння беларуская армія атрымала на ўзбраенне высокатэхналагічную эфектыўную станцыю новага пакалення, — сказаў **намеснік дырэктара па знешнеэканамічнай дзейнасці расійскага канцэрна паветрана-касмічнай абароны «Алмаз—Антэй» Вячаслаў ДЗІРКАЛН.** — Мы ўпэўнены, што гэта зброя перадаецца ў надзейныя рукі і будзе залогам мірнага неба над нашымі краінамі. Хоць, безумоўна, вельмі хочацца, каб вы выкарыстоўвалі гэту станцыю толькі ў вучэбных мэтах.

Пасля аснашчэння ўсіх радыёлакацыйных батальёнаў новымі РЛС, Беларусь канчаткова створыць сістэму разведкі для супрацьракетнай абароны. «Праціўнік» забяспечыць работу найноўшых зенітна-ракетных комплексаў, такіх, як С-300, «Тор» і іншых, а таксама ў перспектыве ЗРК С-400. Усяго да 2020 года плануецца закупіць яшчэ сем такіх станцый, адну з іх — для патрэб Ваеннай акадэміі. Яшчэ адзін важны момант: «Алмаз—Антэй» прадае «Праціўнік» у іншыя краіны ва ўсечанай камплектацыі, але Беларусь стала выключэннем. Міністэрства абароны нашай краіны атрымала найбольш прасунутую мадыфікацыю, якой карыстаюцца ў расійскім войску.

— Станцыя «Праціўнік ГЕ» прыйшла да нас на замену трохкаардынатнай станцыі 22Ж6, — расказаў **камандзір радыётэхнічнай брыгады,** якая атрымала новае ўзбраенне, **палкоўнік Аляксандр ВАРАБ'ЁЎ.** — Пасля таго як мы дасягнулі дамоўленасці на закупку гэтай РЛС, наш разлік быў адпраўлены стажыравацца на завод, дзе яе выпускаюць. На працягу месяца ваеннаслужачыя навучаліся працаваць з тэхнікай, а пасля праводзілі разгортванне і выпрабаванні пад кіраўніцтвам прадстаўнікоў прадпрыемства-вытворцы. Заключным этапам стаў увод у эксплуатацыю. «Праціўнік» дазваляе нам закрыць увесь комплекс задач, якія вырашаюць радыётэхнічныя войскі: ад выяўлення малавысотных, малахуткасных цэляў да суправаджэння ракет, якія рухаюцца па балістычнай траекторыі. Вельмі добра, што гэтая РЛС з'яўляецца, калі можна так сказаць, «унучкай» станцыі 22Ж6, усе інтэрфейсы тут аналагічныя, таму асвоіць гэту тэхніку асабоваму складу будзе нескладана.

Стваральнікі «Праціўніка» паклапаціліся і пра апаратараў, якія будуць абслугоўваць РЛС. На станцыі створаны камфортныя ўмовы для работы асабовага складу, распрацавана эфектыўная сістэма жыццезабеспячэння з кандыцыянаваннем паветра, паніжаным узроўнем шуму і электрамагнітнага выпраменьвання. Не на апошнім месцы стаіць і эканамічны аспект — у абслугоўванні «Праціўнік» абыходзіцца значна таннеі за сістэмы, якія выкарыстоўваюцца ў беларускім войску цяпер.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

■ Жамчужыны Айчыны

# ПА АЎГУСТОЎСКІМ КАНАЛЕ МОЖНА ПЛЫЦЬ «НА ЧЫМ ПАПАЛА»

## А замежным гасцям не спатрэбіцца віза?

**Што робіцца і якія задачы трэба вырашыць, каб максімальна выкарыстаць патэнцыял Аўгустоўскага канала — нашай жамчужыны прыроды і гідратэхнічнага дойлідства? Гэтыя пытанні, якія старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ кантралюе асабіста, абмеркавалі на абласной нарадзе.**



У веламарафоне «Суседзі» ўдзельнічаюць усе ахвотныя.

Паколькі Аўгустоўскі канал праходзіць па тэрыторыі двух краін, Беларусі і Польшчы, то самім лёсам наканавана карыстацца гэтай унікальнай воднай артэрыяй на ўзаемавыгаднай аснове, стварыўшы самыя спрыяльныя ўмовы для турыстаў. А што ў рэальнасці? Дагэтуль перасячы мяжу ў пагранічным пункце пропуску «Лясная-Рудаўка» можна было толькі на водным судне, а пешаходы і веласіпедысты такой магчымасці не мелі. Аднак сітуацыя мяняецца: статус пункту пропуску неўзабаве стане не толькі водным, але і вела-пешаходным. Канешне, турыстычны паток значна павялічыцца, і падрыхтоўка да прыёму вандроўнікаў ужо вядзецца — адрамантавалі будынак пункта пропуску, абнавілі альтанкі, абсталявалі велапаркоўку, устанавілі інфармацыйныя стэнды.

Пры гэтым ствараюцца ўмовы для таго, каб замежныя турысты маглі вандраваць па Аўгустоўскім канале без візы. Мяркуецца, што яна не спатрэбіцца тым, хто будзе перасякаць мяжу (з Польшчы — у пунктах пропуску «Лясная-Рудаўка» і «Брузгі-Кузніца Беластоцкая», з Літвы — у пунктах пропуску «Прывалка-Швэндубрэ» і «Прывалка-Райгардас») для наведвання турысцка-рэкрэацыйнага парка «Аўгустоўскі канал» і прылеглых тэрыторый. Пропуск будзе ажыццяўляцца на падставе дакумента, які пацвярджае мэту паездкі. Дарэчы, падобны вопыт (калі замежныя турысты да пяці сутак знаходзяцца ў нашай краіне без візы) ужо ёсць — такое магчыма пры наведванні Белавежскай пушчы.

Ці гатовы гаспадары дастойна сустрэць турыстаў, якіх у сувязі з навацыямі, верагодна, стане значна больш?

— Неабходна зрабіць усё, каб у зоне Аўгустоўскага канала было ўтульна адпачываць і нашым жыхарам, і замежным гасцям, — падкрэсліў Уладзімір Краўцоў.

У прыватнасці, трэба стварыць дастойныя ўмовы для веласіпеднага руху ўздоўж Аўгустоўскага канала — пабудаваць новыя паркоўкі, палепшыць інфармацыйную маркіроўку на маршрутах. Дарэчы, зусім не фантастычным выглядае прагноз, што канал можа ўвайсці ў склад сусветна вядомых міжнародных веламаршрутаў GreenVelo і EuroVelo. Праўда, для гэтага трэба яшчэ шмат папрацаваць, каб адпавядаць неабходным патрабаванням — напрыклад, трэба, каб на маршруце знаходзіліся аб'екты для харчавання і размяшчэння веласіпедыстаў.

Інвестары, якія захочуць прыйсці са сваім праектам у турысцка-рэкрэацыйны парк «Аўгустоўскі канал», атрымаюць льготы і прэферэнцыі. Адміністрацыя СЭЗ «Гроднаінвест» пракансультуе іх па ўсіх неабходных пытаннях, у тым ліку і тых, што тычацца нюансаў, звязаных з гісторыка-культурнымі і прыроднымі каштоўнасцямі рэгіёна.

### У ТЭМУ

*Начальнік упраўлення спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама Алег АНДРЭЙЧЫК паведаміў, што неўзабаве вандроўнікам прапануюць спецыяльную інтэрактыўную карту з разнастайнай інфармацыяй — у прыватнасці, са звесткамі аб знаходжанні ў зоне Аўгустоўскага канала гістарычных славутасцяў, аб'ектаў адпачынку, харчавання, гандлю, пунктаў пракату веласіпедаў, водных і іншых спартыўных сродкаў. GPS-каардынаты падкажуць турыстам, як дабрацца ў тую ці іншую кропку.*

...З календаром найбольш цікавых спаборніцтваў і фестываляў можна пазнаёміцца, націснуўшы на банер «Аўгустоўскі канал запрашае», які змешчаны на многіх гродзенскіх інтэрнэт-рэсурсах. Акрамя ўжо традыцыйных «фішак» (фестываль воднага турызму «Нёманская вясна», фальклорны фестываль «Аўгустоўскі канал у культуры трох народаў», міжнародны веламарафон «Суседзі»), практычна кожны год дадаецца і нешта новае. Напрыклад, з'явіліся ідэі фестывалю паляўнічых традыцый «Пад апекай Святога Губерта», міжнародных спаборніцтваў па фотарыбалцы «Кубак Марыхі», воднага марафону па грэблі на байдарках «Аўгустоўскі канал», анімацыйнага праекта «Тут пачыналася вайна».

### ДАРЭЧЫ

*20 жніўня ў раёне шлюза Дамброўка адбудзецца фестываль «Аўгустоўскі канал у культуры трох народаў», які скіраваны на папулярызацыю беларускай, літоўскай і польскай фальклорнай творчасці. У яго межах прадстаўнікі раёнаў Гродзеншчыны, а магчыма, і госці з Польшчы паўдзельнічаюць у заплыве «на чым папала» (на плаваючым сродку, вырабленым непрамысловым спосабам), а таксама ў турніры па балотным футболе.*

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*



У вандроўку — на байдарцы.

■ Надвор'е

# Лета вяртаецца

## Ужо ў нядзелю месцамі да плюс 31 градуса

**У бліжэйшыя двое сутак умовы надвор'я на тэрыторыі краіны палепшацца, паведамляе галоўны сіноптык службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі і кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**

Спецыялісты прагназуюць, што ў пятніцу і суботу будзе пераважна без ападкаў, толькі па ўсходзе краіны яшчэ пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі магчымыя навальніцы. Уначы і раніцай у асобных раёнах прагназуецца туман.

Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 8—15 градусаў, а ўдзень чакаецца 20—26 цяпла. У суботу чакаецца плюс 22—28 градусаў, а па паўднёвым захадзе — да плюс 30. У нядзелю надвор'е будзе фарміраваць зона павышанага атмасфернага ціску, якая была створана ў цёплай паветранай масе. Ападкаў пераважна не чакаецца. Уначы ў асобных раёнах магчымы слабы туман, а тэмпература паветра складзе 9—15 цяпла, па захадзе прагназуецца да плюс 17 градусаў. Удзень стане ўвогуле камфортна: чакаецца ад плюс 24 градусаў на паўночным усходзе да 31 цяпла на поўдні краіны.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня на тэрыторыю Беларусі завітаюць франтальныя сістэмы, якія змяшчаюцца з боку Заходняй Еўропы. У панядзелак у асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Але ападкі спякоту не «задавяць». Тэмпература паветра ўначы складзе 12—18 цяпла, а ўдзень прагназуецца да плюс 25—32 градусаў. Кароткачасовыя дажджы будуць паўсюдна і ў аўторак. Тады тэмпература паветра ўначы складзе плюс 13—20 градусаў, а ўдзень чакаецца 19—25 цяпла, па ўсходзе краіны — ад 26 да 30 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Героі сярод нас

# Дзякуй, капітан!

**Бабруйскі ратавальнік Аляксандр Панцілееў нават у адпачынку працягвае дапамагаць людзям.**



Калі б не гэты мужны чалавек, адным жыхаром вёскі Каськова Мсціслаўскага раёна стала б меней. Капітан унутранай службы Аляксандр Панцілееў працуе начальнікам змены пажарнай аварыйнай выратавальнай часці №1 Бабруйска, а ў вёску прыехаў на адпачынак да сваіх родных. Разам з цесцем ён займаўся ўладкаваннем лецішча, калі ўбачыў, што гарыць веранда суседскага дома. Імгненне — і ён быў ужо там. Нехта з людзей сказаў, што ўнутры знаходзіцца чалавек. Праз акно Аляксандр разгледзеў у дымавой заслоне ложак, дзе нерухома ляжаў мужчына. Кожная секунда магла каштаваць таму жыцця. І тады ратавальнік разбіў шыбу, ускочыў у пакой і папоўз да ложка. Едкі дым раздзіраў грудзі, не даваў дыхаць. За акном хваляваліся людзі, ужо і за яго жыццё. Аляксандр узваліў на плечы абмяклае цела і пацягнуў да акна, дзе яго чакаў цесць. Свежае паветра хутка вярнула з непрытомнасці выратаванага пенсіянера. Полымя на яго вачах паядала дом, але яму ўжо нішто не пагражала.



Нават калегі па рабоце ўражаны мужнасцю свайго таварыша. Кажуць, што ён сапраўдны сябар і вельмі шчыры чалавек. А ратавальнікам вырашыў стаць яшчэ ў школе. Напэўна нездарма бацькі далі яму такое імя — Аляксандр. У перакладзе з грэчаскай мовы яно азначае — абаронца людзей.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Не прапусці!

# ШКОЛЬНЫ «СУПЕРМАРКЕТ»

**Для сталічнага гандлю трэцяя дэкада жніўня — традыцыйна самыя «гарачыя» дні, таму што многія сем'і, па традыцыі, адкладваюць паход за школьнай экіпіроўкай на апошнія дні летніх канікулаў.**

Між іншым, у бліжэйшыя выхадныя (20 і 21 жніўня) ў сталіцы пройдзе агульнагарадскі кірмаш «Час у школу!». На пляцоўцы каля Палаца спорту ўвазе пакупнікоў будзе прапанаваны самы шырокі асартымент тавараў да школы: стыльнае і прывабнае адзенне і абутак, пісьмовыя і канцылярскія прылады, сумкі і ранцы, кнігі, развіццёвыя гульні, школьная атрыбутыка. Удзел у кірмашы возьмуць універмагі, гандлёвыя арганізацыі сталіцы, прадпрыемствы-вытворцы канцэрна «Беллегпрам», а таксама іншыя айчынныя тавараўвытворцы з усёй краіны. Фірмовую прадукцыю прадставяць больш як 50 удзельнікаў: акцыянерныя таварыствы «Світанак», «Палессе», «Лідская абутковая фабрыка», «Галантэя», «Алеся», унітарнае прадпрыемства «Ромгільтэкс» і многія іншыя.

Акрамя таго, у рамках кірмашу запланавана правядзенне розных акцый з прымяненнем зніжак. Пройдуць дэманстрацыі мадэляў адзення дзелавога стылю для школьнікаў і абутку беларускіх вытворцаў. Прадугледжаны прыём заказаў на падгонку адзення. Падрыхтавана культурна-забаўляльная праграма з удзелам мастацкіх калектываў прадпрыемстваў, акцыі з уручэннем падарункаў. Час працы кірмашу — з 10.00 да 17.00.

А з 24 па 31 жніўня ў выставачным павільёне «БелЭкспа» (вуліца Я. Купалы, 27) разгорнецца Міжнародная спецыялізаваная выстава-кірмаш «Прывітанне, школа 2016», дзе вядучыя вытворцы і дыстрыб'ютары дзіцячых тавараў змогуць прадставіць найшырэйшы асартымент тавараў для падрыхтоўкі да новага навучальнага года. Тут жа адкрыецца і міжнародная спецыялізаваная выстава-кірмаш тавараў і паслуг «Нашым дзецям 2016».




Вытворцы і імпарцёры плануюць прадставіць навінкі, якія з'явіліся апошнім часам у гэтым сектары рынку. Бацькі школьнікаў і дашкольнікаў змогуць набыць тавары для творчага, разумовага і фізічнага развіцця дзяцей, цацкі, электронныя гульні, дзіцячую мэблю, кнігі і перыядычныя выданні, тавары для будучых маці, сродкі для догляду дзяцей, дзіцячае харчаванне, кандытарскія вырабы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# ХВАЛЯ ШТУЧНАГА ГАТУНКУ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Паводле інфармацыі партала Realt.by, агульны спіс прапаноў ў Мінску складае больш за 7,3 тысячы кватэр і асобных жылых памяшканняў. Аднак тут існуе і каля 5 тысяч аб'ектаў, што выстаўлены на продаж па нерэальна высокіх цэнах, якія працягваюць «боўтацца» ў каталогах па 6-10 месяцаў і больш. Таму і атрымліваецца, што пры знікненні невялікай колькасці таннага жылля статыстыка інфармацыйнага каталога сігналізуе пра павелічэнне сярэдняй цаны прапановы квадратнага метра аднапакаёвых кватэр. Але на самай справе адсутнасць на рынку маленькіх па плошчы і слабенькіх па якасці аднапакаёвых кватэр у старых дамах з цэннікам ад 27 да 30 тысяч долараў (такія лічбы былі ў красавіку і першыя два месяцы лета) ніякім чынам не паўплывала на кошт прапановы кватэр стандартных плошчаў у сучасных панэльных дамах. Так, вельмі таннага жылля на рынку ўжо няма, але гэта не змяніла тэндэнцыю на далейшае патаненне, упэўнены наш эксперт.

**Плануецца старт будаўніцтва толькі некалькіх жылых дамоў з кватэрамі невялікіх плошчаў, дзе квадратны метр жылля запланаваны на ўзроўні 800 долараў.**

## Мінімум — у дыяпазоне 32—36 тысяч долараў

Аналітычна-інфармацыйнае выданне «Нерухомасць Беларусі» прыводзіць сярэднія цэны прапановы, дзе квадратны метр агульнай плошчы ў аднапакаёвай кватэры складае 1234 долары. У двухпакаёвых «квадрат» прапануецца за 1186 долараў, а ў трохпакаёвых — за 1146 долараў. Гэтая табліца сведчыць пра тое, што за апошні тыдзень сярэдні кошт прапановы за квадратны метр павялічыўся адразу на 7 долараў.

Мікалай Прасталупаў лічыць, што гэта не фактычнае падаражанне, а толькі яго ілюзія, калі высновы робяцца на падставе сярэдніх паказчыкаў. Напрыклад, спецыялісты рынку нерухомасці падлічылі, што пры рэальных здзелках куплі бюджэтнага жылля кошт квадратнага метра кватэры складае не больш за 1100-1150 долараў.

Нагадаю, што мінімальны кошт датычыцца жылля на крайніх паверхах і не ў самых добрых мікрараёнах горада. Напрыклад, цяпер у агульным каталогу ёсць падобная аднапакаёўка з плошчай 34 квадратныя метры, якая прапануецца за 32 тысячы долараў. Самае таннае аднапакаёвае жыллё з цэннікам да 40 тысяч долараў прапануецца галоўным чынам у Заводскім раёне, Чыжоўцы і Шабанах. А найбольшая колькасць прапанавання невялікіх кватэр мае дыяпазон цэн ад 40 да 50 тысяч долараў.

## З'явіліся і двухпакаёўкі да 40 тысяч долараў

Менавіта ў час працяглага патанення нерухомасці на сталічным рынку пачынаюць сустракацца экзатычныя па планіроўцы і мінімальныя па плошчы двухпакаёвыя кватэры. Сёння нават цяжка ўявіць двухпакаёўку з агульнай плошчай ад 34 да 38 квадратных метраў і кухняй да 5 «квадратаў». Гэтае жыллё ў даволі старых дамах сёння ставіць рэкорды па мінімальным кошце ў Мінску — 35—38 тысяч долараў. На першых паверхах часам прапануюцца даволі салідныя па плошчы двухпакаёўкі (43—45 кв. метраў) усяго за 39 тысяч долараў.

Увогуле, сёння двухпакаёвыя кватэры з цэннікам да 45 тысяч долараў выстаўлены на продаж толькі ў старых пяціпавярховых дамах сталіцы. Даволі шмат прапаноў стандартных двухпакаёвых кватэр у панэльных дамах. Такое жыллё агульнай плошчай да 52 квадратных метраў выстаўляецца на продаж ужо па кошце ад 50 да 57 тысяч долараў. Калі плошча падобнага жылля перасякоўвае мяжу ў 55-56 квадратных метраў, тады і цэннік на яго падымаецца да 60—70 тысяч долараў. Хапае на рынку двухпакаёвых кватэр з цэннікам ад 80 да 120 тысяч долараў. І гэта зусім не абавязкова цалкам «упакаваныя» кватэры або жылыя памяшканні ў элітных дамах. Часам па такім кошце прапануецца і зусім стандартнае жыллё ў цэнтральных раёнах сталіцы. Вось толькі попыт на яго цяпер нулявы.

Мацней за ўсё за апошні год патанелі шматпакаёвыя кватэры. Сёння на рынку існуе невялікая колькасць трохпакаёвых кватэр, якія прапануюцца па кошце ад 45 да 52 тысяч долараў. Гэта яшчэ тая экзотыка з сумежнымі пакоямі ў старых пяціпавярхоўках і агульнай плошчай да 52 квадратных метраў. Не самае добрае па якасці жыллё з маленькімі кухнямі, аднак квадратны метр у такіх кватэрах каштуе менш за тысячу долараў. Найбольшая колькасць прапановы бюджэтных трохпакаёвак цяпер мае стартавы цэннік ад 60 да 80 тысяч долараў.

Прыкладна на траціну паменшылася ў жніўні колькасць прапановы па асобных пакоях і долях у кватэры. Кошты на іх розныя і залежаць ад розных фактараў, але існуе адна прамая заканамернасць, якая тычыцца метражу памяшкання. Напрыклад, пакой плошчай 14 квадратных метраў па вуліцы Пухавіцкая прапануецца за 12 тысяч долараў, а памяшканне ў 26 «квадратаў» па вуліцы Панчанкі выстаўлена на продаж ужо за 26 тысяч долараў.

## «Далёўка» таннее са скрыпам

Яшчэ прыкладна 6-8 месяцаў таму на першасным рынку сталічнага жылля існавала шмат цікавых прапаноў на самы розны густ. Цяпер сітуацыя крыху змянілася, бо новых праектаў (на стадыі катлавана) узвядзення камерцыйнага жылля стала значна менш.



Фота Надзеі БУЖАН.

Зразумела, што танней за ўсё па лініі долевага будаўніцтва прапануюцца кватэры ў дамах, узвядзенне якіх толькі арганізуецца. Напрыклад, у будучым доме жылога комплексу па вуліцы Максіма Багдановіча квадратны метр агульнай плошчы прапануецца ад 750 долараў. Нагадаю, што 8 месяцаў таму арганізатары будаўніцтва выстаўлялі мінімальныя цэны будаўніцтва з разліку 850 долараў за «квадрат».

Прапанова і сапраўды цудоўная, калі не ўлічваць той факт, што ў доме цяпер прапануюцца толькі шматпакаёвыя кватэры, мінімальная агульная плошча якіх складае 80 квадратных метраў. А менавіта за 750 долараў тут выстаўлены «квадрат» у чатырохпакаёвай кватэры максімальнага метражу. Першы ўзнос складае не менш 30%, а цалкам за жыллё неабходна разлічыцца ўжо сёлета ў снежні. Існуюць тут і плюсы, бо дамы ўзводзяцца не панэльныя, а маналітна-каркасныя, прадугледжаны падземны паркінг, а ў кватэрах — двухкамерныя шклопакеты.

Для тых, хто згодны жыць не ў межах горада, а побач, ёсць выдатная і бюджэтная прапанова. У жылым комплексе «Вясёлка», які будуецца ў аграгарадку Прылукі (6 кіламетраў ад МКАД) будзе ўзведзены цэлы комплекс шматкватэрных панэльных дамоў. А разам з імі пабудуюць дзіцячыя садкі, школы і гандлёвыя цэнтры. Комплекс разлічаны менавіта на чаргавікоў сталіцы. У гэтых дамах цэннік будаўніцтва складае ад 700 да 850 долараў за квадратны метр у залежнасці ад плошчы жылля аднапакаёвых кватэр. Для карэнных мінчан відавочна, што мінусаў у аб'екта хапае, аднак галоўным плюсам з'яўляецца яго нізкі кошт.

У новабудоўлях жылых дамоў, якія ўжо здадзены ў эксплуатацыю, сітуацыя з цэнамі крыху іншая. У комплексе шматкватэрных жылых дамоў у раёне метро «Міхалова» квадратны метр прапануецца па цэнніку ад 1000 да 1200 долараў.

## Мінус 3% — да новага года

На цэнавы трэнд на другасным рынку жылля паўплывае адразу некалькі разнапланавых фактараў. Першы тычыцца даходаў насельніцтва, якія ў доларавым эквіваленце ў бліжэйшы час павялічвацца не будуць, лічыць наш эксперт. Санкцыі супраць Расіі ўдарылі і па нашай эканоміцы.

Атрымліваецца, што свабодных грошай у насельніцтва больш не будзе, а таксама і танных крэдытаў. Менавіта гэтыя фактары павінны спрыяць далейшаму зніжэнню цэн. Але на развіццё сітуацыі паўплывае фактар «звязкі» з тэндэнцыямі на першасным рынку жылля. Гатовае прыватнае жыллё таннее толькі ў тым выпадку, калі зніжаецца кошт будаўніцтва падобных аб'ектаў. Пэўны час цэны ў долевым будаўніцтве памяншаліся, але апошнім часам забудоўшчыкі «заўпарціліся» і ўжо масава не згаджаюцца прапаноўваць патэнцыйным кліентам сур'ёзныя зніжкі.

Мікалай Прасталупаў тлумачыць гэта тым, што зараз жыллё ў новабудоўлях прапануюць тыя арганізацыі, якія пачыналі праекты 2-3 гады таму. У той час кошт квадратнага метра планаваўся на ўзроўні 1300-1400 долараў. Сітуацыя змянілася не толькі па кошце гатовага жылля, але і ў структуры будматэрыялаў, аднак панесеныя раней празмерныя выдаткі не дазваляюць інвестарам выкарыстоўваць больш лаяльную цэнавую палітыку. З другога боку, у Мінску не хапае новых стандартных праектаў. Мікалай Прасталупаў паведаміў, што гэтымі днямі плануецца старт будаўніцтва толькі некалькіх жылых дамоў з кватэрамі невялікіх плошчаў, дзе квадратны метр жылля запланаваны на ўзроўні 800 долараў.

У мінулыя гады ў сталіцы менавіта восенню пачыналася хваля актыўнасці пакупнікоў жылля на другасным рынку. Сёлета падобная спецыялісты ўжо не чакаюць. Таннае жыллё пакупнікі на рынку вымылі яшчэ ўвесну і за два месяцы лета, таму цяпер і ў кароткачасовай перспектыве (у бліжэйшыя 5 месяцаў) чакаецца даволі спакойная сітуацыя са стабільнымі цэнамі і павольным зніжэннем цэннікаў.

**У каталогу ёсць аднапакаёўка з плошчай 34 квадратныя метры, якая прапануецца за 32 тысячы долараў.**

Далейшае патаненне кватэр на другасным рынку жылля прагназуецца нашым экспертам мінімум да пачатку новага года. Мікалай Прасталупаў амаль упэўнены, што арганізатары долевага будаўніцтва вымушаны будуць узводзіць у Мінску больш стандартнага масавага жылля ў выглядзе дамоў панэльнага тыпу. Больш за тое, на фоне мінімальнага попыту забудоўшчыкі пачнуць прапаноўваць кліентам кватэры толькі крыху даражэйшыя за іх сабекошт. У выніку кошт квадратнага метра для кліентаў у панэльных дамах будзе надалей зніжацца і ў межах горада амаль паўсюдна складзе 800 долараў. А гэта ў сваю чаргу прывядзе і да патанення кватэр на другасным рынку жылля. Спадар Прасталупаў прагназуе, што да новага года цэны на кватэры знізяцца яшчэ на 2-3%.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■ Сітуацыя

**Пажарны апавяшчальнік выратаваў сям'ю з шасці чалавек**

# МАЛЫ ТАЛЕР, ДЫ ДАРАГІ

**Раніцай ад жыхара аграгарадка Падарок Ваўкавыскага раёна ратавальнікам паступіла паведамленне аб пажары. І ўжо праз пару хвілін першыя разлікі былі на месцы здарэння — гарэла маёмасць у драўляным доме.**

Як расказалі самі гаспадары, іх разбудзіў гук пажарнага апавяшчальніка. Мужчына прыадчыніў дзверы з жылога пакоя і ўбачыў клубы дыму. Выйсці праз дзверы было ўжо немагчыма. Тады ён адчыніў акно, дапамог выбрацца на вуліцу жонцы, а затым перадаў ёй дзяцей — шасцігадовую дзяўчынку і трох хлопчыкаў 2008, 2013 і 2016 гадоў нараджэння. Пасля чаго і сам пакінуў дом.

25-гадовы гаспадар паведаміў, што сам устанавіў у спальні і дзіцячым пакоі два пажарныя апавяшчальнікі. Як аказалася, недарма — прыбор своечасова папярэдзіў сям'ю аб небяспецы і, па сутнасці, яе выратаваў.

Верагодна, пажар здарыўся з-за самаробнага катла. Агонь знішчыў маёмасць у пакоі, пашкодзіў бытавую тэхніку, мэблю і сцены. Жыць у доме пакуль немагчыма і сям'я будзе часова пражываць у маці гаспадыні.

### У ТЭМУ

*Згодна з інфармацыяй* ***прэс-сакратара Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС Наталлі ЖЫВАЛЕЎСКАЙ****, з 2002 года ў краіне дзякуючы пажарным апавяшчальнікам выратаваліся каля дзвюх тысяч чалавек. Толькі за мінулы год гэтым прыборам абавязаны жыццём 23 жыхары Гродзеншчыны (у тым ліку двое дзяцей), сёлета — ужо 12.*

*Бяда часцей за ўсё прыходзіць у начны час, калі людзі спяць і сітуацыя ў доме практычна не кантралюецца. Пажар небяспечны, перш за ўсё, высокай тэмпературай і моцным задымленнем. У сне чалавек удыхае дым, які ўтрымлівае шмат таксічных рэчываў, і літаральна на працягу некалькіх хвілін гэта можа прывесці да смерці. Аўтаномны пажарны апавяшчальнік своечасова выявіць узгаранне і, адпаведна, дапаможа выратаваць людзей і пазбегнуць матэрыяльных страт.*

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
*prakopchik@ zviazda.by*

# І новыя грошы спрабуюць падрабіць

**Затрыманы жыхар Пінска пры спробе рэалізацыі падробленых грошай новага ўзору.**

Як паведамілі ў прэс-службе Брэсцкага абласнога УУС, яшчэ на мінулым тыдні стала вядома пра некалькі фактаў збыту ў горадзе фальшывых купюр наміналам 5 і 20 рублёў. Было ўстаноўлена некалькі злачынных схем, з дапамогай якіх зламыснік збываў вырабленыя ім грошы. Так, купюры наміналам у 20 рублёў ён даваў падлеткам 10-12 гадоў з прапановай купіць чыпсы, а рэшту вярнуць яму. А пяцірублёўкі збываў пенсіянер, які гандляваў агароднінай на рынку. Паступова аператыўнікі выйшлі на след таго, хто гэтыя грошы вырабляў.

У сваёй кватэры быў затрыманы 20-гадовы юнак. Больш таго, ён знаходзіўся ў вышку, бо без дазволу пакінуў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, дзе адбываў пакаранне за крадзеж. Пры ім былі знойдзены тры фальшывыя купюры вартасцю ў 5 рублёў. Была канфіскаваная ўся апаратура, на якой вырабляліся грошы, а таксама 5 падробленых купюр старога ўзору.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

Звязда. Наперад у мінулае. Сумесны праект «Звязды» і «Беларусь 3»

# Новае жыццё старажытных песень

## У наступным сезоне праграма «Наперад у мінулае» зменіць фармат

**Цяпер у цэнтры ўвагі апынуцца не асобныя беларускія народныя песні, што выконваюцца аўтэнтычнымі калектывамі, а потым набываюць новае жыццё ў сучасных аранжыроўках, а цэлыя абрады. Пра новую канцэпцыю праекта і «справаздачны» канцэрт «200 песень для Беларусі», што цяпер рыхтуецца да эфіру, мы гутарым з аўтарамі праграмы Аксанай і Анатолем ВЕЧАРАМІ.**

**Анатоль:** — Каб пазбегнуць уключэння ў праграму аўтарскіх, не зусім народных беларускіх песень, мы вырашылі здымаць абрады. Тут ужо «несапраўдных» твораў быць не можа. У нас даўно была такая ідэя: здымаем адзін і той жа абрад у некалькіх рэгіёнах Беларусі, штотыдзень цягам месяца расказваем пра яго адметнасці ў кожнай мясцовасці, а ў апошнім выпуску — раз на месяц — іх аб'ядноўваем у міні-мюзікл. Вырашылі не толькі перапрацоўваць новыя запісаныя ў экспедыцыях песні, але і дадаваць у выніковыя праграмы яшчэ і тыя кампазіцыі з 200 раней зробленых, што тычацца пэўнага абраду — тым больш калі яны ўжо сталі хітовымі. Атрымаецца сучасна-старажытны абрадавы мюзікл. Некалькі разоў мы спрабавалі зрабіць мюзікл на базе нашых песень, але з розных прычын не атрымалася. Тым, над чым будзем працаваць у новым сезоне, пацешым і сябе, і гледача. Мне падаецца, што павінна быць цікава.

**Аксана:** — Сюжэтная частка так і застанецца ў выкананні бабуль, аўтэнтычных спявачак, а музычнае напаўненне складуць народныя песні ў сучаснай апрацоўцы.

> «Мы ўжо зладзілі дзве экспедыцыі — на Любаншчыну і Смаргоншчыну, хутка выправімся на Полаччыну».

***— Вы не баіцеся, што з боку даследчыкаў фальклору можа быць вельмі крытычная рэакцыя на такі эксперымент з абрадавымі песнямі? Бо адна справа — песні сямейна-бытавыя, лірычныя, застольныя, якія цалкам лагічна падаваць у сучаснай інтэрпрэтацыі, але ж абрадавыя — зусім іншая рэч. Яны ў прынцыпе не павінны змяняцца з цягам часу, а тым больш — асучасніваца.***

**Анатоль:** — Я чуў, што некалі ў Амерыцы выдалі «Вайну і мір» у коміксах. Прыкладна такі варыянт прадстаўлення абрадаў мы і прапануем. Усё роўна аснoўная частка нашых гледачоў не будзе паглыблена вывучаць матэрыял. А прыгледзеўшы праграму, яны атрымаюць хоць нейкае ўяўленне пра тыя з'явы, што калісьці існавалі ў нашай краіне. Трэба таксама мець на ўвазе, што кожны абрад звычайна заканчваецца бяседай, а за сталом гучаць не толькі абрадавыя спевы. Мы ўсё роўна будзем звяртаць увагу на розныя песні. Нават падчас першай у новым сезоне экспедыцыі на Жыткавіччыну, дзе мы здымалі жніво, запісалі адну застольную песню, якую ў сучасным варыянце будзе выконваць Галіна Грамовіч. Яна не зусім жніўная, але ўвойдзе ў праграму пра Дажынкі.

**Аксана:** — Думаю, фалькларысты разумеюць: тое, што мы робім, — гэта «папсовы» варыянт. Калі распавялі пра задуму Алегу Хаменку з гурта «Палац», ён сказаў: важна хоць так падтрымліваць нашу традыцыйную культуру. Канечне, Іван Кірчук з «Троіцы» працуе з фальклорам на нейкім касмічным узроўні, захоўваючы аўтэнтыку. Мы ўсё ж такі прадстаўляем лёгкі варыянт, разлічаны на масавую аўдыторыю. Я перакананая, што тыя абрады, якія мы здымаем, больш нагадваюць пастаноўку, рэканструкцыю. Зразумела, яны занатаваныя ад старажылаў, але сёння адроджаныя наноў. Мы ж проста выконваем сваю ранейшую місію: захаваць, паказаць гледачу хоць некаторыя моманты нашай традыцыйнай культуры.

***— Калі можна будзе пабачыць у эфіры выпуск «Наперад у мінулае» ў новым фармаце?***

**Анатоль:** — Новая праграма, што будзе прысвечана Дажынкам, выйдзе ў эфір ужо ў першы тыдзень верасня. Яе мы запісалі ў вёсцы Вобчын Любанскага раёна. Звычайна абрад Дажынак у розных рэгіёнах нязначна адрозніваецца, але менавіта на Любаншчыне ёсць некалькі элементаў, якія раней нам былі не вядомыя. Так, напрыклад, прынята дзяўчатам праласціць пад сярпамі, а каб быць здаровымі — качацца па зжатым полі са словамі «На коніка лой, на ніўку гной. А мне на здароўе». Думаю, што для фалькларыстаў тут не знойдзецца нічога новага, але шырокаму гледачу безумоўна будзе цікава. Мы ўжо зладзілі дзве экспедыцыі — на Любаншчыну і Смаргоншчыну, хутка выправімся на Полаччыну, дзе таксама будзем запісваць абрады Дажынак, вяселле і хрэсьбіны.

**Аксана:** — Падчас нядаўняй экспедыцыі на Смаргоншчыну быў адзін смешны выпадак. Пакінулі на полі «бараду» — нязжаты кавалак. Дзяўчаты сказалі патрэбныя словы і пачалі жаць. Жалі-жалі і ўсё зжалі. А адна бабуля кажа: «Што ж вы нарабілі, трэба было пакінуць колькі каласоў, каб абвязаць стужкай!» Але мы знайшлі выйсце, каб у праграме ўсё выглядала правільна: уваткнулі каласы проста ў зямлю.

***— Ужо бачыце розніцу ў праўдзенні беларускіх абрадаў у розных мясцовасцях? Заўважаеце іх рэгіянальныя асаблівасці?***

**Анатоль:** — Мы пакуль завіталі толькі ў два рэгіёны. Гэтыя абрады тут адрозніваюцца, але не вельмі значна. Нейкія высновы можна будзе зрабіць хаця б праз паўгода экспедыцый. Розніца бачыцца не толькі таму, што самі абрады маюць мясцовыя адметнасці ў іх аўтэнтычным бытаванні. Многае залежыць і ад сучасных выканаўцаў: нехта вельмі скрупулёзна падыходзіць да справы, а нехта робіць проста дзеля справаздачы.



Анатоль ВЕЧАР сочыць за працэсам запісу праграмы ў вёсцы Казловічы на Случчыне.

**Аксана:** — Так, параўноўваць пакуль цяжка. Але для сябе я заўважыла некалькі адметных момантаў. Даведалася, што раней на Жыткавіччыне, у вёсцы Буразь, дзіця месяцаў да трох у калыску не клалі, а трымалі ў начоўках. Маленькіх дзяцей таксама нельга было купаць: толькі пасля нараджэння абмывалі вадою, а потым цягам некалькіх месяцаў проста абціралі. Заварочвалі дзяцей у ношаныя жаночыя і мужчынскія кашулі, якія ўжо сталі танюсенькімі.

***— За гады існавання праекта «Наперад у мінулае» вы зладзілі мноства экспедыцый, сабралі багаты матэрыял. Гэта сапраўдная скарбонка для фалькларыстаў.***

**Анатоль:** — Так, мы захоўваем фактычна ўсе запісы.

**Аксана:** — Неяк мы запісвалі гурт Apple Tea, ім вельмі спадабалася працаваць у нашай праграме, таму нават планавалі зрабіць альбом цалкам пабудаваны на фальклорным матэрыяле. Не ведаю, ці атрымалася. Былі розныя думкі наконт пашырэння ўжытку нашых архіўных запісаў, магчыма, нешта з задуманага рэалізуем.

***— А ў канцэртным, сучасным жыцці айчынных выканаўцаў старыя песні, праспяваныя на новы манер, знаходзяць месца? Яны выконваюцца?***

**Анатоль:** — Аляксандр Сухараў кажа: як толькі на канцэрце пачынаюць гучаць песні з нашага праекта, зала рэагуе зусім па-іншаму. Мы неяк размаўлялі з вядомым украінскім музыкам Алегам Скрыпкам, далі паслухаць некалькі песень з праекта, ён быў у захапленні. Была і такая гісторыя: едучы ў цягніку, папулярная расійская спявачка Алена Ваенга пачула песню з нашага праекта «З-за каго я сохну» ў выкананні Яны Старцавай. Ёй вельмі спадабалася песня, і Ваенга са Старцавай разам яе выканалі тут, у Мінску. І падчас выступлення Ваенгі ў маскоўскім Крамлі наша песня таксама гучала. Шкада толькі, што словы пераклалі на рускую мову. Па-першае, пераклад не дакладны, а па-другое, словы народных песень і не трэба перакладаць. Як і Уладзіміра Караткевіча нельга чытаць па-руску.

**Аксана:** — А Uzari распавядаў, што нават на канцэртах у Германіі песню на палескім дыялекце «Скрыпка бы ны грала» прымалі проста выдатна.

***— Часта атрымліваеце водгукі ад гледачоў?***

**Аксана:** Мы ж, уласна кажучы, да нашага гледача і ездзім у экспедыцыі, у розных мясцовасцях Беларусі мяне ўжо як сваю ўспрымаюць. Вельмі добра, што выпускі праграмы больш-менш рэгулярна сталі з'яўляцца ў інтэрнэце, на афіцыйнай старонцы тэлеканала «Беларусь 3» на YouTube. Дарэчы, у нас там досыць вялікая колькасць праглядаў

**Анатоль:** — Сапраўды, наш глядач у асноўным — з рэгіёнаў. Таксама ёсць водгукі людзей, якія жывуць за мяжой, яны не могуць ужываю дакрануцца да традыцыйнай культуры. Ім вельмі падабаецца праграма — яна ж транслюецца і на канале «Беларусь 24».

***— У межах праграмы «Наперад у мінулае» вы ўжо запісалі 200 песень і рыхтуецеся да канцэрта-справаздачы...***

**Аксана:** — Так, мы завяршаем лета акурат двухсотай песняй. А канцэрт «200 песень для Беларусі», над якім мы цяпер працуем, будзе складацца з дзвюх частак: падчас першай прадставім лепшыя песні з першай сотні, а падчас другой — тыя, што запісалі ўжо ў другой сотні. У эфір канала «Беларусь 3» канцэрт выйдзе 4 і 11 верасня.

***— Можа, крыху прыадкрыеце таямніцу, што гледачы пабачаць на канцэрце?***

**Анатоль:** — Першую частку канцэрта Аксана правядзе з Аляксандрам Сухаравым — ён быў першым выканаўцам, які ўдзельнічаў у нашым праекце, яшчэ калі мы запісвалі пілотны выпуск. Гэта была песня з вёскі Маршалкі. На жаль, калектыву ўжо не існуе, але галасы спявачак гучаць у нашых запісах, і песня жыве. А другую — з аранжыроўшчыкам Кірылам Ермаковым.

**Аксана:** — Для канцэрта мы сабралі самыя лепшыя песні, якія прагучалі ў межах праекта за гэтыя гады. Тут выступяць не толькі эстрадныя выканаўцы, прывязём у Мінск і аўтэнтычныя гурты з рэгіёнаў. Мы іх папрасілі зрабіць свае каверы на сучасныя песні, вельмі цікава паслухаць, што атрымаецца. Напрыклад, гурт «Крынічанька» з Рудзенска прадставіць сваю версію адной з песень Вольгі Плотнікавай — яна некалі выканала іх песню. Гурт з Лагойска перапрацуе адну з кампазіцый каманды «Без білета», дзіцячы калектыў «Калыханка» прадставіць сваю версію песні Тэа «Чызкейк», гурт з Анопаля выканае адну з песень Ані Шаркуновай, таксама прагучаць прыпеўкі пра беларускую эстраду. На жаль, не ўсе запланаваныя ўдзельнікі канцэрта зараз знаходзяцца ў Мінску. Але мы знайшлі рашэнне: арганізуем тэлемасты, анлайн-уключэнні, напрыклад, для Руслана Мусвідаса, гурта «Без білета», каб хоць віртуальна гэтыя выканаўцы маглі быць з намі. Але не буду раскрываць усіх картаў. Глядзіце — і самі ўсё пабачыце.



Гутарка Аксаны ВЕЧАР з майстрам падчас экспедыцыі праекта «Наперад у мінулае» ў вёску Восава Салігорскага раёна.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
vesialuha@zviazda.by

## Серада, 24 жніўня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.45** Зона Х.
**9.10, 22.00 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Жаночы доктар».**
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Паміж намі, дзяўчынкамі».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.05** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.35** Дзень спорту.
**0.50 Серыял «Дзявочае паляванне».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 20.55** Тэлебарометр.
**9.05, 17.40 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**10.25** «Арол і рэшка. На краі свету». Трэвэл-шоу.
**11.30** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**12.40, 18.45 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**13.30, 19.45 Серыял «Кухня».**
**14.35** «Моду народу». Шоу-праграма.
**15.30** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.10, 23.45 Трылер «Анёл ці дэман».**
**17.10** «Вулічная магія». Рэаліці-шоу.
**21.30** Хачу ў тэлевізар!
**21.35** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**21.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-оф. Матч у адказ.
**0.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-оф. Матчы ў адказ. Агляд.

### Беларусь 3

**8.00, 12.40, 18.45, 21.00** «Калейдаскоп».
**8.15** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**8.20, 17.35 «Адкрытая кніга». Драма. Фільм першы.**
**9.25, 20.00** «Колы Краіны Саветаў. Былі і небыліцы». Дак. фільм «Перадайце за праезд».
**10.05** «Святыні Беларусі». Царква ў гонар Раства Прасвятой Багародзіцы (в. Лукава).
**10.35** «Святло далёкай зоркі». Памяці мастака Леаніда Дубара.
**11.00 «Варажба на рамонку». Камедыя.**
**12.55 «Халоднае лета пяцьдзясят трэцяга...» Драма.**
**14.35** Канцэрт гурта «Палац».
**15.30 «Супраць цячэння». Маст. фільм.**
**16.40, 23.15** «Апаленыя ўладай. Крамлёўскі дзед». Дак. фільм.
**19.00** «Выбары-2016».
**20.40** «Калыханка».
**21.15 «Нябёсы запаветныя». Трагікамедыя.**

### Беларусь 5

**8.00, 19.05, 23.35** PRO спорт. Навіны.
**8.10** Авертайм.
**8.40** Спорт-кадр.
**9.15** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. «Юнацтва-Мінск» (Беларусь) — «Векшэ Лейкерс» (Швецыя).
**11.10, 19.15** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Выбранае.
**14.15, 16.10, 23.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-оф. Матч у адказ.
**18.10** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-оф. Матчы ў адказ. Агляд гульнявога дня.
**18.40** Козел пра футбол.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-оф. Матчы ў адказ. Анлайн гульнявога дня.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.20** «Таблетка».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Тальянка».**
**22.55 Камедыя «Пінгвіны містара Попера».**
**0.40** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.00** «Тайны Чапман».
**9.30** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.35** «Не хлусі мне!»
**12.35, 18.05** «Званая вячэра».
**13.50** «Тэрыторыя памылак».
**15.35** «Вадзіць па-руску».
**16.10** «Аўтапанарама».
**16.50** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**17.10** «Ведай нашых!»
**17.35 «Следакі». Серыял.**
**19.00** Выступленні кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.50 «Джокер». Серыял.**

### МІР

**6.00** «Добрай раніцы, свет!»
**9.05 Серыял «Банды».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 19.20 Серыял «Адлюстраванне».**
**16.20, 2.45** Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**16.50** «Сакрэтныя матэрыялы».
**17.20, 3.15 Серыял «Невідзімкі».**
**22.00 Маст. фільм «Каханне і страхі Марыі».**
**23.45** Ток-шоу «Слова за словам».
**0.40 Маст. фільм «Той, хто побач».**
**2.15 Дак. серыял «Іншы свет».**
**4.45 Маст. фільм «Антон Іванавіч злуецца».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Уся Расія».
**12.15 Серыял «Запіскі экспедытара тайнай канцылярыі».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Там, дзе ты».**
**19.10, 20.40 Серыял «Тайны следства».**
**21.40, 23.10 Серыял «Вясной расцвітае каханне».**
**1.00** Выбары ў Дзяржаўную думу Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі. Дэбаты.

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.25 Серыял «Дэльта».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.20** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.45** «Тайны следства».
**14.15 Серыял «Кодэкс гонару».**
**15.05, 16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**19.40 Серыял «Масква. Цэнтральная акруга. Апошні сезон».**
**22.10** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**22.30** «Вынікі дня».
**23.00 Серыял «Шаман».**

### 8 канал

**7.00, 14.25, 19.20, 21.05, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.20, 14.30 Камедыя «Дзюплекс».**
**8.45, 18.05 Серыял «Абацтва Даўнтан».**
**9.45 Серыял «На дарозе».**
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00 Камедыя «Шпіён».**
**12.50 Камедыя «Дзень радыё».**
**14.20, 15.55, 18.00, 19.15, 21.00** «Хатняя крама».
**16.30** «Дзецям пра зверанят».
**16.40** Кінаблакнот.
**17.00 Серыял «Выгнаннікі».**
**18.45** «Мой любімы гадаванец».
**19.25 Серыял «Уцёкі».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Драма «Недатыкальныя».**
**23.00 Серыял «Баншы».**

### ВТБ

**6.00, 17.00, 4.00** «Лаві момант».
**6.30, 17.30, 23.45, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**7.00, 3.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.30, 18.00** Серыял «Тата навырост».
**8.30** М/ф «Маша і мядзведзь».
**9.00, 13.45** «Ералаш».
**9.30, 19.10** Серыял «Васьмідзясятыя 6».
**10.40** Серыял «Збеглыя сваякі».
**11.20, 23.15** «Уральскія пельмені».
**12.00, 21.30** Серыял «Кухня 6».
**14.20** Серыял «Апошні з Магікян 3».
**15.00, 20.20** Серыял «Святлафор 6».
**16.10, 5.00** «Турбаміксер».
**0.00** Еўрапейскі покерны турнір.
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка».
**3.00** «Дурні і дарогі».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.20** «Свінарка і пастух». Маст. фільм.
**11.45** «Марына Ладыніна. Кіназорка паміж сярпом і молатам». Дак. фільм.
**12.30** «Сваё гняздо» Дастаеўскага». Дак. фільм.
**12.50** «Усевалад Сафонаў». Дак. фільм.
**13.30, 23.50** «Следства вядуць знатакі». Тэлефільм.
**15.10** «Абсалютны слых».
**15.50, 18.10, 2.40** Сусветныя скарбы.
**16.10** «Мы з джаза». Прачнуцца знакамітым». Дак. фільм.
**16.50** «Бывай, ХХ стагоддзе! Віктар Астаф'еў».
**17.30, 1.55** Майстар-класы Міжнароднай музычнай акадэміі Юрыя Башмета. Таццяна Самуіл і Джэраен Рулінг.
**18.30** «Гісторыя кінаначальнікаў, або Будаўнікі і перабудоўшчыкі. 80-я гады». Дак. серыял.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** З залатой калекцыі айчыннага тэлебачання. Эльдар Разанаў. Сустрэча ў Канцэртнай студыі «Астанкіна». Запіс 1984 года.
**21.15** «Сэрцы чатырох». Маст. фільм.
**22.45** «Залатое цяля». З такім шчасцем — і на экране». Дак. фільм.
**23.45** Мастсавет.
**1.20** «Масква — Берлін. Заўтра вайна». Дак. серыял.
**1.50** «Франсіска Гоя». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Дыскатэкі 80-х». 2005 год.
**7.05, 8.35, 9.40, 11.00, 11.35, 13.05, 15.40, 17.00, 20.40, 21.40, 0.45, 1.40, 2.45, 3.05** Музычная настальгія.
**7.30** «Вясёлыя рабяты». 1990 год. 1-я частка.
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.20** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары».
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «ГКЧП: Апошняя «дзекабрысты» Вялікай Імперыі». 2005 год.
**12.55** Дак. фільм «Навіны дня. Хроніка нашых дзён».
**13.30** Дак. фільм «Ці будзе камунізм».
**18.00** «Спяём, сябры!» з Наталляй Казялковай. 2005 год.
**19.10** Маст. фільм «Белая птушка з чорнай меткай».
**23.00** Канцэрт «Песня-76».
**0.00** «Акулы пяра». Барыс Грабеншчыкоў. 1996 год.
**1.00** «Рок-н-рол ТБ». 1992 год.
**2.00** Дак. фільм «Навіны дня. Хроніка нашых дзён».
**2.20** «Час пік» з С. Шатуновым. 1995 год.
**3.00** «Сядзі і глядзі». Музычна-парадыйная праграма. 1994 год.
**3.30** Маст. фільм «Амаль смешная гісторыя».

### EuroSport 1

**4.00, 7.00, 9.30, 15.00, 16.00, 21.30, 1.00** Веласпорт. «Вуэльта».
**5.30, 11.00, 19.00, 23.00** Тэніс. Australian Open-2016. Жанчыны. Фінал.
**8.00, 13.30, 20.15, 0.00, 2.30** Тэніс. Australian Open-2016. Мужчыны. Фінал.
**12.30** Футбол. Таварыскі матч. «Барусія» (Дортмунд) — «Хадешар».
**15.45, 18.45** Веласпорт. «Вуэльта»-экстра.

### КИНОКОМЕДИЯ Кінакамедыя

**0.50** «Жалезнае неба». Камедыя.
**2.30** «Той яшчэ Карласан!» Камедыя.
**4.00** «Высокі бландзін у чорным чаравіку». Камедыя.
**5.35** «Гэта пройдзе, але калі?» Камедыя.
**7.10** «Вялікі Стэн». Камедыя.
**9.05** «Поўнае ператварэнне». Камедыя.
**10.35** «Чужое вяселле». Меладрама.
**12.10** «Каханне і іншыя акалічнасці». Меладрама.
**14.00, 14.50, 15.45** «Паміж намі». Скетчкам.
**14.15, 15.05** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** «Вох, ужо гэты водпуск». Камедыя.
**17.40** «Мой самы страшны кашмар». Меладрама.
**19.30** «Машына часу ў джакузі». Камедыя.
**21.15** «Доля анёлаў». Камедыя.
**23.00** «Дом з паранармальнымі з'явамі 2». Камедыя.

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.45** «Доктар І...»
**8.15, 19.00, 1.40** «Гісторыя кахання». Серыял.
**9.40, 3.40** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.25** «Сляпая».
**12.25** «Варажбітка».
**13.30, 5.10** «Тайныя знакі».
**14.30** «Шафа».
**15.20** «Здзелка».
**15.50** «Жанна, пажані».
**16.50, 21.35** «Рэвізора».
**17.55** «Тайны следства». Серыял.
**20.40, 0.50** «Блокбастары».
**22.40** «Зоркі і містыка».
**23.20** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.05** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**2.55** «Нераскрытыя тайны».

### TV 1000 ТБ1000

**6.10, 18.20** Фантастыка «Дзіця чалавечае».
**8.10, 4.30** Баявік «Прыстанак зла 4: Жыццё пасля смерці».
**10.10, 2.20** Драма «Рамэа і Джульета».
**12.15** Камедыя «Эд з тэлевізара».
**14.25** Меладрама «Бурлеск».
**16.30** Трагікамедыя «Шукаю сябра на канец свету».
**20.10** Трылер «Улада страху».
**22.20** Трагікамедыя «Моцная жанчына».
**0.40** Трылер «11:14».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 18.20** Меладрама «Тры таварышы».
**8.20, 2.20** Камедыя «30 спатканняў».
**10.10, 4.20** Трагікамедыя «Зусім не простая гісторыя».
**12.20** Трагікамедыя «Яно».
**14.30** Камедыя «Бясслаўныя прыдуркі».
**16.20** Баявік «Ірэй-сан. Спаведзь самурая».
**20.20** Драма «Каралёў».
**22.30** Іншае кіно. Драма «Пецяпа дарозе ў Царства Нябеснае».
**0.30** Трылер «Халодны фронт».

### National Geographic

**6.00** Навука будучыні.
**7.30, 8.15, 11.15, 14.40, 18.50, 4.50** Навуковыя недарэчнасці.
**7.50, 14.15** Гульні розуму.
**9.00, 12.00, 15.00, 21.00, 0.50, 3.10** Незвычайныя промыслы.
**10.30, 18.00** Сапраўдны геній.
**12.45, 16.30, 23.15** Расследаванні авіякатастроф.
**13.30** 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.
**17.15, 0.00** Паранармальнае.
**19.40** Пагоня за леднікамі.
**22.30, 2.25** Космас. Прастора і час.

### Discovery

**8.00** Эфект Карбанара.
**9.00, 14.00, 21.30** Як гэта ўстроена?
**9.30, 14.30, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.00, 17.00** Гаражнае золата.
**11.00, 7.10** Рыбацкія легенды.
**12.00** Поўны фарсаж.
**13.00, 6.20** Як уладкаваны Сусвет.
**15.00, 5.30** Калекцыянеры аўто.
**16.00, 2.55** Вялікі махінатар.
**18.00** Вулічныя гонкі.
**19.00** Махінатары.
**20.00** У пагоні за класікай.
**22.00** Іржавая імперыя.
**23.00** Бітвы за кантэйнеры.
**0.00, 2.00, 4.40** Паляўнічыя на рэліквіі.
**1.00** Склады.
**2.55** Вялікі махінатар.
**3.50** Маланкавыя катастрофы.
**4.15** Сапраўдныя аферысты.

## Усходні гараскоп на



**АВЕН.** У пачатку тыдня ўсё будзе ісці добра, можна нават сказаць, што па плане. Вы будзеце пажынаць плады сваёй дзейнасці, зможаце атрымаць асалоду ад прыемнай кампаніі. У аўторак і чацвер менш гаварыце, больш слухайце. Непажадана марнаваць час і нервы на плёткі. Не варта недаацэньваць сілу сваёй прывабнасці: з яе дапамогай вы здольныя лёгка раззброіць многіх апанентаў. У выхадныя дні надайце больш увагі сям'і і дому — і пераканайцеся, што блізкія вас любяць і шануюць.



**ЦЯЛЕЦ.** На гэтым тыдні вы будзеце падобныя да чараўніка: вашы жаданні ажыццяўляцца нейкім цудоўным чынам. Так што асноўная задача — захацець, астатняе прыкладзецца. Магчымыя карысныя і канструктыўныя сустрэчы са старымі партнёрамі па бізнесе і сябрамі. На працу, хутчэй за ўсё, вы будзеце прыходзіць у прыўзнятым настроі і з добрым запасам сіл. Сярэдзіна тыдня будзе запоўненая прыемнай мітуснёй і клопатамі. Памятайце, што ад вашага эмацыянальнага стану і настрою залежыць і настрой блізкіх людзей.



**БЛІЗНЯТЫ.** Вельмі спрыяльны тыдзень. Ён будзе суправаджацца чарадой яркіх і выдатных падзей. Гэта, верагодна, доўгачаканае падарожжа з каханым чалавекам ці з сябрамі, выкананне даўніх жаданняў і задум. Вас ахоплівае кругаварот разнастайных эмоцый і спраў. Прачнуцца новыя імкненні, вы літаральна загарыцеся ўнутраным агнём і пачнеце актыўную дзейнасць у новым для вас кірунку. Можа ўзнікаць толькі адна праблема — як усё паспець і нікуды не спазніцца. Складана будзе праяўляць дыпламатычнасць у некаторых сітуацыях, але паспрабуйце стрымаць свой гнеў і раздражненне.



**РАК.** Выдатны час для творчасці, які дазволіць увасобіцца ў жыццё многім вашым ідэям. Каб завалодаць сітуацыяй, неабходна праявіць рашучасць і ініцыятыву. У сярэдзіне тыдня выпадзе шанц паказаць сябе з лепшага боку на працы, атрымаць адабрэнне начальства і матэрыяльнае ўзнагароджанне. Набыты вамі новы вопыт адкрые іншыя магчымасці ў прафесійнай сферы. Добры час для сяброўскіх сустрэч. Сітуацыя можа схіляць да вырашэння даўніх праблем.



**ЛЕЎ.** Любімая работа можа стаць крыніцай жыццёвых сіл, тым больш што вашы адносіны з калегамі і начальствам цалкам добразычлівыя і гарманічныя. У аўторак найлепшых вынікаў дасягнеце ў тым, да чаго будзе схільная ваша душа. У сераду пры дробных няўдачах не адчайвайцеся і старайцеся дамагчыся сваёй мэты. У другой палове тыдня магчыма сутыкненне інтарэсаў і нават сварка. У пятніцу ў выніку саманадзейнасці вы рызыкуеце загнаць сябе ў кут. У выхадныя дні больш часу надавайце адпачынку, трэба аднавіць душэўную раўнавагу.



**ДЗЕВА.** Тыдзень будзе напоўнены разнастайнымі падзеямі і прыемнымі сустрэчамі. Паспрабуйце раскрыць свой творчы патэнцыял. У чацвер можаце разлічваць на дапамогу сяброў. Калі ў вас з'явіцца пачуццё ўнутранага пратэсту ў адносінах да змены месцаў, пажадана адмовіцца ад далёкіх камандзіровак. Паспрабуйце не раздражняцца па дробязях, а ўпарта імкніцеся да вызначанай мэты. Паступова хмары рассеюцца, і вы ўбачыце новыя гарызонты. Выхадныя лепш правесці на прыродзе.

## Субота, 27 жніўня

### 1 Беларусь 1

**6.50** Існасць.
**7.15, 21.40 Меладрама «Мая любімая пачвара».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Клуб рэдактараў.
**9.50 Серыял «Сваты-5».**
**11.05** 50 рэцэптаў першага.
**12.10** Дача.
**12.50** Здароўе.
**13.45, 15.45 Меладрама «Вой, ма-мач-кі!»**
**15.15** Краіна.
**21.00** Панарама.
**0.55** Дзень спорту.

### 2 Беларусь 2

**7.00 Серыял «Класная школа».**
**7.55** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
**8.50, 20.55** Тэлебарометр.
**8.55 Серыял «Шчаслівыя разам 2».**
**10.55 Анімацыйны фільм «Шрэк».**
**12.30** Капейка ў капейку.
**13.05** «Вялікая ілюзія на Кіпры».
**13.40** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**14.40** «Моду народу». Шоу-праграма.
**15.35** «Бітва экстрасэнсаў. XII».
**17.50** «Чалавек-невідзімка». Рэаліці-шоу.
**18.55** «Здзіві мяне 3». Талент-шоу.
**21.10 Камедыя «Славі мяне, калі зможаш».**



**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.50 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**

### 3 Беларусь 3

**7.50, 13.20, 16.05, 21.00** «Калейдаскоп».
**8.05, 16.25 «Жаніх з таго свету». Камедыя.**
**8.55** «Легенды беларускай эстрады». Якаў Навуменка. «Раманс пра закаханага».
**9.20** Анталогія «Славянскага базару». «Славянскі базар у Віцебску-1995».
**10.15 «На сямі вятрах». Драма.**
**11.55** «Партызаны супраць Вермахта». Дак. серыял, заключныя серыі.
**12.50** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**13.35** «Час кіно».
**13.45 «Колер граната». Драма.**
**14.55** «Камертон». Акцёр і выканаўца бардаўскай песні Сяргей Джыгурда.
**15.25, 21.20** «Засакрэчанае каханне. Нелегальнае танга». Дак. фільм.
**17.10** «Навукаманія».
**17.40 «Скарбы Трої». Маст. фільм.**
**20.40** «Калыханка».
**22.00 «Толькі не цяпер». Меладрама.**

### 5 Беларусь 5

**8.00, 22.50** PRO спорт. Навіны.
**8.10** Хакей. Таварыскі матч. Беларусь — Францыя.
**10.05** Тэніс. Турнір WTA. Нью-Хэйвен. 1/2 фіналу.
**14.15, 20.25** Плаванне. Кубак свету. Парыж.
**16.40** Алімпійскія гульні. Рыа-2016. Выбранае.
**18.25** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. ФК «Мінск» — «Нёман» (Гродна).
**23.00** Тэніс. Турнір WTA. Нью-Хэйвен. Фінал.

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
**9.25** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.05** «Ідэальны рамонт».
**12.05** «Валянціна Цялічкіна. Неферціці з правінцыі».
**13.20 Камедыя «Асцярожна, бабуля!»**



**15.00** «Фаіна Ранеўская. Прыгажосць — страшная сіла».
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Тэорыя змовы».
**17.20** «Удача ў прыдачу! З «Еўраопт».
**18.00** «Хто хоча стаць мільянерам?»
**19.00 Трылер «У кожнага свая хлусня».**
**21.05** «Сёння вечарам».
**22.35** Музычны фестываль «А-Фэст». Канцэрт гурта «Brainstorm».
**23.40 Маст. фільм «Тоні Роум».**

### СТБ

**6.45 «Фірменная гісторыя». Серыял.**
**7.35** «Анфас».
**7.50 Меладрама «Інтуіцыя».**
**9.25** «Рамонт па-сумленнаму».
**10.05** «Ежа багоў».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.35** «Далёкія сваякі».
**11.45 «Салдаты 12». Серыял.**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40, 0.15 Маст. фільм «Вуліца поўная нечаканасцяў».**
**15.00** «Самая карысная праграма».
**15.50** «Вялікі горад».
**16.40** «Наша справа».
**16.55** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**18.35** «Прагнасць».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Нам і не снілася».
**22.35 «Крапавы берэт». Серыял.**

### МІР

**6.00, 8.20, 15.10** М/ф.
**7.55** «Саюзнікі».
**9.00** «Вой, мамачкі!»
**9.30** «Няма праблем».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15, 5.25** «Зроблена ў СССР».
**10.45 Маст. фільм «Тайна «Чорных драздоў».**
**12.35** «Цяжар абеду».
**13.05 Маст. фільм «Нябесны капітан і свет будучыні».**
**16.15, 20.15 Серыял «Смерць шпіёнам».**
**22.05 Маст. фільм «Блізня».**
**0.05 Серыял «Цыганкі».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**7.40 Маст. фільм «Пашанцуе ў каханні».**



**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.15 Камедыя «Настаўнік спеваў».**
**12.45, 14.15** Міжнародны конкурс маладых выканаўцаў папулярнай музыкі «Дзіцячая Новая хваля-2016».
**15.50 Маст. фільм «Таму што кахаю».**
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.35 Камедыя «Чаго хочуць мужчыны».**
**22.15 Маст. фільм «Не таго поля ягада».**

### НТБ—Беларусь

**5.50** «Астрапрагноз».
**5.55, 8.20 Серыял «Дарожны патруль».**
**8.00, 10.00, 14.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.40** «Вуснамі немаўляці».
**9.25** «Урачэбныя тайны плюс».
**10.25** «Галоўная дарога».
**11.05** «Ежа жывая і мёртвая».
**12.05** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** «Удача ў прыдачу!»
**14.15, 16.20 Серыял «Кодэкс гонару».**
**18.10** «Следства вялі...»
**19.25 Серыял «Масква. Цэнтральная акруга. Апошні сезон».**
**21.10 Маст. фільм «Суддзя».**

### 8 канал

**9.00, 15.55, 19.55, 21.15, 23.40** «Надвор'е».
**9.05** М/ф.
**9.50 Серыял «Абацтва Даўнтан».**
**10.40** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**10.50, 16.00, 18.50, 21.00** «Хатняя крама».
**11.05 Серыял «На дарозе».**
**14.30** Мультпарад.
**16.10** «Адшукваецца адпачынак».
**16.40** Кінаблакнот.
**16.55, 19.00, 20.00 Серыял «Палюбоўніца д'ябла», 1—4 серыі.**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Фэшн is my прафэшн».
**21.20 Драма «Зайздрасць багоў».**

### ВТБ

**6.00, 7.30, 5.30** «Лаві момант».
**6.30** «Паспець за 24 гадзіны».
**8.00, 13.30, 23.00, 4.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30** М/ф «Прыгоды Дзіна».
**8.45** М/ф «Смяшарыкі».
**9.00** М/ф «Маша і мядзведзь».
**9.30, 12.00** «Ералаш».
**10.00, 1.00** «Турбаміксер».
**12.30, 23.30** Скетч-шоу «Валера ТБ».
**14.00** «Кіно ў дэталях».
**15.00** Камедыя «Шары лютасці».
**17.00** «Уральскія пельмені».
**18.30** Серыял «Апошні з Магікян 3».
**20.30** Фэнтэзі «Джэк — пакарыцель веліканаў».
**0.30** Скетчкам «Студэнты».
**3.30** «Дурні і дарогі».
**4.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
**10.35** «Мiміно». Маст. фільм.
**12.10, 13.50, 15.00, 18.05** «Маналог у 4-х частках. Армен Мядзведзеў».
**12.40, 23.45** 120 гадоў з дня нараджэння Фаіны Ранеўскай. «Падкідыш». Маст. фільм.
**14.15** «Возера ў моры». Дак. фільм.
**15.30** 120 гадоў з дня нараджэння Фаіны Ранеўскай. «Вясна». Маст. фільм.
**17.10** «Гэта было. Гэта ёсць... Фаіна Ранеўская».
**18.35** «У добры час!» Маст. фільм.
**20.10** «Песня не развітваецца... 1974 год».
**21.00** «75 гадоў з дня нараджэння Багдана Ступкі. «Тарас Бульба». Маст. фільм.
**23.00** «Астравы». Багдан Ступка.
**1.00** «З жыцця вожыка ў перыяд глабальнага пацяплення». Дак. фільм.
**1.55** «Шукальнікі». «Радзіма чалавека».
**2.40** Сусветныя скарбы.

### Настальгія

**6.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. 2008 год.
**6.55, 8.35, 9.40, 11.00, 13.05, 14.50, 15.40, 17.40, 18.55, 19.35, 23.10, 2.45, 3.40** Музычная настальгія.
**7.20** Маст. фільм «Інспектар ДАІ».
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Нараджаныя ў СССР».
**11.10** «Тэатральны раман» з Эдвардам Радзінскім. «Маскоўскія тэатры ў 80-я гады...»
**12.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1962. 2-я частка. 2010 год.
**13.20** Маст. фільм «Дзікая сабака Дзінга».
**16.00** «Колба часу».
**17.00** «Кінапанарама». «Ганна Маньяні». 1983 год. 2-я частка.
**18.00** «Тэма» з У. Лісцьевым: «Усерасійскі рэферэндум аб даверы Б.М. Ельцыну». 1993 год.
**19.10** «Голас народа». 1991 год. (Маналогі ў «будцы галоснасці»).
**20.30** «Час пік» з У. Лісцьевым. 1995 год.
**21.00** «Быў час». 2009 год.
**22.00** Маст. фільм «Не баліць галава ў дзятла».
**23.25** «Рок-н-рол ТБ». 1993 год.
**0.00** «Спяём, сябры!» з Наталляй Казялковай. 2005 год.
**1.10** Маст. фільм «Белая птушка з чорнай меткай».
**5.00** Канцэрт «Песня-76».

### EuroSport 1

**3.30** «Спорт знутры».
**4.00, 7.00, 9.30, 16.00, 21.30, 1.00** Велаcпорт. «Вуэльта».
**5.30** Тэніс. Australian Open-2016. Найлепшае.
**6.30, 9.00, 0.30** Watts.
**8.00** Тэніс. «Ралан Гарос»-2016. Найлепшае.
**11.00, 19.00, 2.30** Скачкі з трампліна. Летні Гран-пры.
**14.15, 20.30** Велаcпорт. «Тур дэ л'Авенір».
**15.45, 18.45** Велаcпорт. «Вуэльта»-экстра.
**23.00** Конны спорт. Кубак нацый.
**0.00** Ралі ERC.

### Камедыя

**1.05** «Дом з паранармальнымі з'явамі». Камедыя.
**2.40** «Дом з паранармальнымі з'явамі 2». Камедыя.
**4.15** «Поўнае ператтварэнне». Камедыя.
**5.50** «Шчаслівае сямейства». Камедыя.
**7.25** «Палярны рэйс». Камедыя.
**9.05** «Вох, ужо гэтыя дзеці». Камедыя.
**10.45** «Вох, ужо гэтыя бацькі». Камедыя.
**12.25** «Вох, ужо гэты водпуск». Камедыя.
**14.10** «Пазнаёмцеся з Уолі Спарксам». Камедыя.
**16.00** «Кухар на колах». Камедыя.



**18.00** «Настаўнік года». Камедыя.
**19.55** «Каханне і іншыя акалічнасці». Меладрама.
**21.45** «Душэўная кухня». Камедыя.
**23.30** «Цяжарны». Камедыя.

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.00** «Хронікі маскоўскага побыту».
**10.50** «Доказ віны».
**11.25, 1.00** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**15.05** «Астрабой». Анімацыйны фільм.
**16.30** «Блокбастары».
**17.35, 4.15** «Алігарх ТБ».
**18.10** «Хэлоў, Раша».
**19.10** «Неадэкватныя людзі». Камедыя.
**21.20** «Закладніца-2». Баявік.
**23.05** «Каліфрэнія». Серыял.
**23.35** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**4.40** «Імя. Зашыфраваны лёс».

### ТБ1000

**6.10, 18.05** Драма «Саліст».
**8.10, 2.00** Драма «Быць Флінам».
**10.10** Камедыя «Сенсацыя».
**12.05, 4.00** Трылер «Найлепшая прапанова».
**14.20** Трылер «Без кампрамісаў».
**16.05** Меладрама «Жонка падарожніка ў часе».
**20.10** Драма «Філамена».
**22.10** Драма «Спакуса».
**0.20** Камедыя «Драйвер на ноч».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 16.10** Камедыя «Тата напракат».
**8.20, 2.20** Меладрама «2 дні».
**10.10, 4.10** Баявік «Паляванне на Піраннью».
**12.30** Драма «Марыяна».
**14.10** Меладрама «Смайлік».
**18.10** Трылер «Рускі трохвугольнік».
**20.00** Драма «Палюбоўнік».
**22.20** Меладрама «Зоймемся любоўю».
**0.10** Драма «Танкер «Танга».

### National Geographic

**6.00** Навука будучыні.
**6.45, 7.35, 8.45, 13.20** Гульні розуму.
**7.10, 8.00, 14.30, 5.10** Навуковыя недарэчнасці.
**11.50** Незвычайныя промыслы.
**12.35, 23.40** Расследаванні авіякатастроф.
**14.50** 80-я. Найвялікшыя футбольныя моманты.
**15.40** 80-я. Найвялікшыя тэхнічныя навінкі.
**16.30** 90-я. Найвялікшыя футбольныя моманты.
**17.10** 90-я. Найвялікшыя трагедыі.
**18.00** 2000-я. Час, калі мы ўбачылі ўсё.
**19.25** Космас. Прастора і час.
**20.10** Морган Фрыман. Гісторыі пра Бога.
**21.00** Забойства Ісуса.
**22.30** Зорная гутарка.
**0.30, 2.50** Эвакуацыя Зямлі.
**1.20, 3.40** Прарыў.

### Discovery

**8.00** Смяротны ўлоў.
**9.00, 2.00** Першапраходцы.
**10.00** Амерыканскі Тарзан.
**11.00, 4.40** Паляўнічыя на рэліквіі.
**12.00** Іржавая імперыя.
**13.00** Бітвы за кантэйнеры.
**14.00** Махінатары.
**15.00, 2.55, 6.20** У пагоні за класікай.
**16.00, 5.30** Вулічныя гонкі.
**17.00** Браты Дызель.
**22.00** Інжынерыя немагчымага.
**23.00** Мегаперавозкі.
**0.00** Вяртанне Монстра Мако.
**1.00** Лясны патруль.
**3.50, 7.10** Разбуральнікі легенд.

## Zамор'е

## ФОТАСЕСІЯ НАД ПРОРВАЙ

**У Нацыянальным лясным парку Чжанцзяцзе ў правінцыі Хунань, дзе не так даўно адкрыўся самы высокі і самы доўгі ў свеце шкляны мост, маладыя вырашылі зладзіць незвычайную фотасесію. Яны размясціліся пад мостам над прорвай, лежачы на невялікай пляцоўцы, падвешанай на тросах, перадае Xinhua.**



Яна — любіць рызыку, ён пакутуе на боязь вышыні. Нягледзячы на гэта, жаніх падтрымаў ідэю сваёй каханай — ажаніцца на вузкім гамаку, падвешаным да шклянога моста паміж дзвюма скаламі на вышыні 180 метраў. Зрэшты, страхавачны строп з рук маладых чалавек так і не выпусціў. Для здымкаў маладой пары быў таксама выкарыстаны дрон.

Падвесны мост Zhangjiajie Grand Canyon Skywalk даўжынёй 430 метраў працягнуты над каньёнам. Распрацоўшчыкі сцвярджаюць, што на ім можа адначасова знаходзіцца 800 чалавек. Канструкцыя пабіла некалькі рэкордаў: яна з'яўляецца самым доўгім у свеце шкляным пешаходным мостам, самым цяжкім падвесным шкляным мостам. Акрамя таго, гэта мост з самай высокай пляцоўкай для скачкоў на гумавым канаце. Ён таксама з'яўляецца адзінай у свеце падобнай канструкцыяй, для стабілізацыі якой выкарыстоўваецца магнітнае, воднае і электрычнае дэмпфіраванне вібрацыі.

## ГЭТА БЫЛА МАЯ КУРЫЦА!

**У Хайфе ў Ізраілі рэлігійны суд часова пазбавіў мясцовую жыхарку права весці гутаркі з яе мужам. Гэта адбылося пасля таго, як жанчына пабіла свайго спадарожніка жыцця з-за... курыцы, піша NEWSru Israel.**



Сямейны канфлікт стаў падставай для разгляду ў рабінскім судзе, куды звярнуўся збіты галава сямейства. Ён прасіў духоўных настаўнікаў выдаць распараджэнне аб выдаленні з дому яго жонкі. Заяўнік указаў, што жонка збіла яго падчас прыступу гневу. Жанчына была незадаволеная тым, што мужчына дакрануўся да «яе курыцы» ў маразілцы і размарозіў яе. Суддзі пастанавілі, што муж і жонка працягнуць жыць у адной кватэры, аднак забаранілі жанчыне ўступаць у размовы з мужам на працягу двух тыдняў, каб не ўчыняць новыя звады. Вядома, што муж і жонка некаторы час таму пачалі працэдуру разводу, аднак пры гэтым яны працягваюць жыць пад адным дахам.

## ЗАСНУЎ... НА МЕСЦЫ ЗЛАЧЫНСТВА

Інцыдэнт адбыўся ў горадзе Дзіўнагорск Краснаярскага краю. П'яны 22-гадовы жыхар горада разбіў шкло ў піцэрыі і залез унутр, жадаючы выкрасці грошы з касы. На запісе камеры відэаназірання відаць, як мужчына, апынуўшыся ў цэмры, спрабуе знесці касавы апарат, але натыкаецца на агароджу. Відавочцы выклікалі паліцэйскіх, якія прыехалі на месца злачынства і заспелі гора-рабаўніка, які мірна спаў. Мабыць, піцы наеўся.

**Іван КУПАРВАС**




## НЕ САДЗІСЯ НА ПЯНЁК...

У дзяцінстве я была дужа непаседлівай, нават непаслухмянай. Напэўна, таму са мной вечна нешта здаралася: то маме на калаўроце накручу сукаратак, то перад самай школай наступлю на цвік (нага распухла, як тая калода!), то на швейнай машынцы свой палец прашыю...

Але ж найбольшы жах давялося перажыць аднойчы ў лесе.

Падышла, значыць, наша чарга адпасваць кароў (іх тады многа было: у кожным двары па адной, па дзве, а то і па тры, не тое што цяпер: на трыста двароў — аж чатыры штукі!). Сабралі мы з татам статак. Я за ім ззаду іду, ледзьве паспяваю, бо малая, бо дзень яшчэ толькі займаецца, і спаць мне хочацца-хочацца, аж ножкі не ідуць... А тата — наперадзе крочыць. Ён пaглядае, каб нейкая вельмі шустрая з рагуль не шмыгнула дзе ўбок, я ж павінна сачыць, каб ніводная з кароў не адстала...

Такім вось парадкам гонім статак у лес, бо на калгасную сенажаць — бронь божа: бяды не абярэшся... А ў лесе, месцамі, нейкія прагаліны ёсць, а то і палянкі.

На адной з іх, бачу, трава сакавітая, высокая. Каровы адразу ж запыніліся і толькі хвастамі пакручваюць — ці то ад аваднёў, ці то ад смакаты... А калі ім добра, то пастухам жа і пагатоў. Думаю: дай я адпачну крыху. Села на пянёк, вочкі заплюшчыла і... заснула.

Колькі часу прайшло, не ведаю. Гэта цяпер малыя кату па пяту, а ўжо з залатымі завушнічкамі ды мабільнымі тэлефонамі... Я ж нават пра гадзіннік не марыла.

Прахапілася, значыць, і сцяміць не магу, дзе я, чаму ў лесе, дзе дом, каторая гадзіна?.. А потым як хто бомкай па лбе: «А дзе ж каровы?!» Хачу паклікаць тату — ад страху голас прапаў. Ісці таксама не магу, бо ногі не трымаюць...

Але ж і сядзець ніяк не выпадае. Прабегла ў адзін бок у пошуках таты, кінулася ў другі, у трэці... Нідзе нікога няма! Нарэшце — хапіла розуму — стала прыглядацца да слядоў: ага, каровы, як бачым, управа пайшлі? Я таксама следам...

Потым тата казаў, што па лесе я прабегла недзе з кіламетр. Мне ж здалося, што цэлых дзесяць, а то і больш...

З радасці, што ўбачыла і статак, і тату, слёзы пацяклі ручаём.

Карацей, мне навука была: пасля гэтага выпадку падчас радовак я над кароўкамі, што называецца, крукам стаяла. Пра тое, каб прысесці адпачыць нават думак не было!

А тады...

Тата, дзякаваць богу, зусім не сварыўся. Можа, таму, што не на жарт напалохаўся і сам?

**А. Сцяпанава,**

*Уздзенскі раён.*

## СМЕЛАСЦЬ ГАРАДЫ БЯРЭ!

Некалі Някрасаў пісаў, што руская жанчына: «Коня на скаку остановит, в горящую избу войдёт». Мая гісторыя пра жанчыну нашу, беларускую, якая, апроч іншага, яшчэ і мужа ад хуліганаў адбіла. Вось як пра гэта расказала яна сама.

«У той вечар мы з Аляксеем вярталіся з пікніка. Нашы сябры на машыне падвезлі нас ледзь не да самага дома. А далей...

Ідзём, мы, значыцца, цераз двор, а насустрач — дзве мужчынскія постаці.

— Дай закурыць, — загадваюць мужу як у нейкім дрэнным кіно.

Той, цвярозы, ну напэўна ж, сказаў бы «Не куру», альбо «Не маю», што чыстай праўдай было б. Але ж ён — добра выпіўшы, а таму ўзяўся даводзіць гэтым курцам (пры бліжэйшым аглядзе яны аказаліся маладымі і досыць здаровымі), пра што папярэджвае Міністэрства аховы здароўя, як курэнне адбіваецца на патэнцыі... Адным словам, — чытаць мараль. Каму гэта можа спадабацца? Ды нікому!

— Заткніся! — кінуў адзін з хлапцоў. Ды яшчэ і размахнуўся, каб... стукнуць.

Шчасце, што ў майго рэакцыя добрая: ён паспеў адхіліць галаву. А ў выніку тым кулаком дасталося па твары... мне.

Сцярпець такое я, вядома ж, не магла: мяне ніхто ніколі не біў!

— Ах ты, гад! — закрычала нападніку і замахнулася на яго цяжкой (кілаграмаў на дзесяць) сумкай з посудам, які мы бралі з сабою.

Хуліган быў таксама вёрткі — ад удару ўхіліўся, але гэта «распаліла» мяне яшчэ больш.

— Кулакі распусціў, бандзюга! — закрычала я, і сумка з посудам зноў засвістала ў паветры.

Хлопец яўна не чакаў нічога падобнага і ўрэшце... даў драпака. Я — пабегла следам за ім, а, калі зразумела, што дагнаць не ўдасца, як той спартсмен-малатабоец, наўздагон яму ў абедзве рукі запусціла сумку — прычым досыць трапна, бо пацэліла акурат у спіну, ад чаго хуліган праз некалькі няўпэўненых крокаў... такі зануруў галавой у траву.

— Ой, мусіць, забіла?! — сказала я мужу, які ў гэты час тузаўся з другім хуліганам.

Сіла слоў і сапраўды часам спрацоўвае лепш, чым кулак, бо той хуліган, пачуўшы пра забойства, таксама кінуўся наўцёкі, прычым — пад... рогат мужа.

— Ты чаго смяешся? — пытаюся ў яго.

— А ты паглядзі, — кажа Аляксей і паказвае пальцам, куды — канкрэтна — мне трэба глядзець.

Я азіраюся і таксама пачынаю рагатаць, бо відовішча там — яшчэ тое! Хуліган, які толькі што тузаўся з маім мужам, бяжыць першым. А следам за ім, кульгаючы, «нясецца»... «нябожчык», той самы, што я прыбіла».

...Не ведаю, як каму, а мне вось гэта гісторыя нагадала не адночы бачаныя «паядынкі» нашых ласкавых котак з вялікімі сабакамі.

А яшчэ — прыказку пра тое, што калі не можаш узяць нешта сілаю, то можна — розумам, альбо іншым спосабам ці, як у гэтым выпадку, смеласцю.

**Валерый Гаўрыш,**

*г. Чавусы.*

## ДЗЕ ГЭТА ВУЛІЦА? ДЗЕ ГЭТЫ ДОМ?

У пачатку 80-х гадоў я з сям'ёй пераехаў з Хоцімска ў Бабруйск на так званае ПМЖ. Пасяліўся ў доме нумар 22, што на вуліцы Мінскай, уладкаваўся на працу і ў хуткім часе атрымаў першую на новым месцы зарплату. Хлопцы сказалі, што гэта грэх не адзначыць, да таго ж на календары якраз была пятніца...

Я схадзіў у краму па гарэлку, узяў так званага «калянвала» коштам па 3 рублі 62 капейкі, і мы, чыста мужчынскай кампаніяй, добра-такі пасядзелі, пагаманілі. Але ж, дзякаваць богу, яшчэ пры памяці былі, бо вырашылі, што ў грамадскім транспарце нас, нецвярозых, лёгка могуць «замесці» ў выцвярэзнік, а таму па дамах трэба раз'язджацца на таксі.

Хлопцы пазванілі ў дыспетчарскую, машына падрулііла аж да самых весніц, мы, як белыя людзі, паселі і паехалі. Таксіст, вядома ж, папытаўся — хто куды? Па ўсім выглядала, што мой дом на гэтым шляху самы першы, таму я пачаў тлумачыць, куды, канкрэтна, трэба кіраваць:

— Там, — кажу, — «асаблівая прыкмета» ёсць: на дахах чатырох дамоў з ляппачак заклік складзены: «Наш труд — тебе, Родина!». Дык на маім доме — слова «тебе».

Кіроўца тут жа сказаў, што будынкі гэтыя добра ведае, бо яны здалёку відаць.

І сапраўды, мы лёгка патрапілі на нашу вуліцу, у наш двор, а калі мая жонка адчыніла мне дзверы, я быў проста шчаслівы! «А ўсё, — меркаваў, — з-за чаго? З-за таго, што ёсць гэты заклік!..»

І толькі потым пераканаўся, што працуе ён не заўжды...

Ва ўсякім разе з Бабруйска, як і з Хоцімска, я па-ранейшаму часта стаў ездзіць да сваіх бацькоў у вёску Баркалабаў — трэба ж было і праведваць, і нечым дапамагаць.

Дык вось у адзін з прыездаў я купіў там новыя лёгкія чаравікі — вярнуўся ў іх дамоў у Бабруйск, усё лета пранасіў. А тут «раптам» восень. Мне б абуць нешта іншае... І я ўспамінаю, што мае старыя туфлі засталіся ў вёсцы.

Невялікая, думаю, бяда: у Баркалабаў часцяком наязджае мая сястра з Мінска. Можна ёй сказаць і прывязе, бо па дарозе ж...

Сказаў. Выхадныя прайшлі. Не прывезла.

Паехаў па чаравікі сам, — а іх, высвятляецца, у вёсцы няма. Кажуць бацькі, што сястра забрала.

«Ну не сама ж іх, — думаю, — носіць?»

Тэлефаную ў Мінск. І чую, што яна заязджала ў Бабруйск, што дзверы ў нас былі замкнутыя, а таму мяшок з картопляй і каробку з маімі чаравікамі яна пакінула ў нашых... суседзяў.

Я нічога не разумею!

Таму сястра тлумачыць далей, і ў які гэта дзень было, і якой парою. А галоўнае, кажа, што ад'язджаючы, на дах нашага дома зірнула:

— Там, — даводзіць, — як ты і казаў, слова «труд» свяцілася.

— Я не мог такога казаць! — перапыніў я сястру. — Бо на нашым доме свяціцца слова «тебе»!

— А па мне дык што адно, што другое,— крыху памаўчаўшы адказала сястра. — Дом жа акурат такі самы!

Калі яна, родная, не змагла адрозніць мой дом ад суседняга, то ці варта тады здзіўляцца, што доктар Лукашын з Масквы апынуўся ў кватэры настаўніцы Шавялёвай у Ленінградзе? Я, напрыклад, гэтаму зусім не здзіўляюся.

Але ж рады, што ў нашым горадзе былі Дажынкі, што перад імі нашы аднолькавыя дамы пафарбавалі ў розныя колеры. Цяпер іх, напэўна, ужо не зблытаеш?

**М. Дзігалёў,**

*г. Бабруйск.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

*dounar@zviazda.by*

■ Неасабісты суб'ектыў



# НЕЦІКАВАСЦЬ? НЕЦІКАЎНАСЦЬ!

## Колькі слоў у абарону Рагачова і астатніх беларускіх паселішчаў

НЯДАЎНА з калегамі зайшла размова пра маючы адбыцца ў Рагачове Дзень беларускага пісьменства. Гаварылі пра арганізацыю, пра цікавосткі, якія завабяць чытачоў, пра афармленне адмысловага павільёна. Пра тое, ці варта ехаць туды раней — падчас свята тым, хто на ім непасрэдна задзейнічаны, паглядзець сам горад наўрад ці ўдасца. «Няма чаго там раней рабіць. Горад абсалютна ніякі, звычайны савецкі райцэнтр»,— калега, якая гаварыла гэта, была вельмі катэгарычная, і не паверыць ёй было нельга: яна ўжо ездзіла туды нядаўна «на разведку»...

І ўсё ж я не паверыла ні яе словам, ні яе ўражанням, і вам не раю. Таму што горад, які амаль дзевяць летапісных стагоддзяў стаіць на гэтай зямлі, не можа быць нецікавы ў прынцыпе. А калі ўжо пра сваё, асабістае: аднойчы напрыканцы верасня ён падараваў мне дзівосную, надзвычай цікавую сустрэчу, і гэта нашае знаёмства ў залатым святле сонечнай восені стала адным з самых прыемных уражанняў у жыцці...

МАГЧЫМА, так з самага пачатку атрымалася, бо ехала туды, перачытаўшы Караткевічаву «Ладдзю Роспачы», герой якой, вельмі сімпатычны Гервасій Выліваха, быў, як вядома, рагачоўцам. (Дарэчы, сам пісьменнік менавіта гэтага свайго героя лічыў «тыповым беларусам, які больш за ўсё любіць жыццё і Радзіму».)

І шмат чаго супала з тым, што напісана было ў той аповесці. Толькі дзеля таго, каб убачыць, «як Дняпро п'е Друць», варта было прыехаць у Рагачоў. Бо гэта сапраўды ўражвае: калі стаіш на ўзвышшы, а літаральна пад нагамі зліваюцца дзве вялікія ракі, і далей ужо Днепр коціць свае воды адзін — больш паўнаводны і магутны. Вялікая рака кіруе жыццём у гэтых мясцінах спрадвеку, яна ўвесну дагэтуль вымывае з зямлі сведчанні жыцця старажытных людзей — менавіта тут выяўлены першабытныя стаянкі. (Мясцовыя школьнікі пасля паводкі збіраюць па берагах артэфакты, якія археолагі шукаюць пад пластамі зямлі.) А на аднапавярховых прыбярэжных вуліцах Рагачова і сёння ці не каля кожнай хаты пабачыш човен. І ўжо зусім нескладана паверыць і ўявіць, як на такім чоўне катаў каліcь Выліваха дзесьці тут саму каралеву Бону Сфорцу...



Дарэчы, тое, што каралева-італьянка мела да Рагачова самае непасрэднае дачыненне, — зусім не выдумка. Яна сапраўды атрымала горад у падарунак ад яснавяльможнага мужа, бывала тут і нават пабудавала на Замкавай гары аднапавярховы будынак, як кажуць даследчыкі, вельмі падобны да тых палаца, што будавалі ў XVI стагоддзі на яе радзіме ў Італіі. Будынак той, няхай і апошнія пяўтара стагоддзя занядбаны, стаяў на ўзвышшы да апошняй вайны. Пасля, як фактычна ад усяго горада, ад яго засталіся руіны, і аднаўляць ужо практычна не было чаго. Але ён застаўся на фота трыццатых гадоў, ёсць і дэталёвы план збудавання. А значыць, ёсць у яго і надзея на адраджэнне: Ліда, Косава, Ружаны... Можа, калі-небудзь да спісу паселішчаў, дзе старажытныя будынкі вернутыя з небыцця, дададуцца і Рагачоў?..

КАНЕШНЕ, можна казаць, што Рагачоў з пункту гледжання наяўнасці помнікаў архітэктуры — месца нецікавае па прычыне іх амаль поўнай адсутнасці. А вы ведаеце, чаму іх там няма? Сёлета даволі шмат пісалі пра 75-годдзе Рагачоўска-Жлобінскай аперацыі, падчас якой улетку 41-га нашыя войскі некалькі разоў пераходзілі ў контрнаступленне. Гэта аперацыя ды яшчэ гераічная абарона Магілёва паўплывалі на зыход славутай бітвы пад Масквой: фашысты затрымаліся на нашай тэрыторыі, бліц-крыг быў сарваны, да сталіцы яны падступіліся толькі зімой... Ды вось Рагачоў падчас той аперацыі нашы і фашысты адбівалі адзін у аднаго разоў сем. Нескладана ўявіць, што засталося ад горада ў тым пекле... І, пагадзіцеся, ведаючы гэта, ужо зусім па-іншаму ставішся да «тыповай забудовы савецкага райцэнтра»...

Можна сказаць, што тут больш фантомнага, чым рэальнага, як той неісную́чы палац каралевы. Да прыкладу, ля мясцовых могілак на ўскраіне горада ёсць месца, дзе, як сведчыць паданне, адбываліся падзеі, амаль дакументальна апісаныя ўсё тым жа Караткевічам у апавяданні «Паром на бурнай рацэ» (пралогу да рамана «Нельга забыць»). У 1863 годзе тут пакаралі смерцю ўдзельнікаў паўстання пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Адным з расстраляных быў Тамаш Грыневіч, прататып Уcяслава Грынкевіча, а па некаторых звестках — продак пісьменніка па мацярынскай лініі. Мясцовае паданне сцвярджае: каб гараджане не ўшанавалі памяць забітых, на месцы іх пахавання некалькі дзён, бы па пляцы, маршыравалі царскія салдаты. Праўда гэта ці не, невядома, але за паўтара стагоддзя рагачоўцы не далі таму месцу зарасці хмызняком ці быллём, а нядаўна там з'явіўся крыж і помнік...

А на цiхай вуліцы прыватнага сектара стаіць стары драўляны дом з высокімі вокнамі *(на фота)*. Побач — гранітная пліта з надпісам: «Гэты дом доўгія гады быў творчым прытулкам выдатнага беларускага пісьменніка Уладзіміра Караткевіча». Сюды, на вуліцу Чкалава (цяпер яна нарэшце Караткевіча), пісьменнік часта прыязджаў у госці да дзядзькі. Яму тут адводзілі асобны пакой — у Рагачове Уладзіміру Сямёнавічу заўсёды добра пісалася. Вядома, што большая частка рамана «Каласы пад сярпом тваім» пісалася менавіта тут. Месцічы расказваюць, што ўранку часта можна было бачыць пісьменніка ў чоўне на Дняпры. І падняпроўскія краявіды, апісаныя і ў «Каласах...», і ў «Ладдзі Роспачы», абсалютна пазнавальныя. На месцы, дзе нібыта расла тая самая груша, апісаная ў першых радках хрэстаматыйнага рамана, нават паставілі памятны знак...

ГЭТА толькі некалькі штрыхоў з «партрэта» нецікавага Рагачова. Пры жаданні можна давeдацца нашмат больш, калі не глядзець паверхоўна, калі ўмець назіраць, а галоўнае — пагаварыць з дасведчанымі месцічамі. Маю тут на ўвазе не толькі Рагачоў — у кожным горадку, у кожным мястэчку знойдзецца чалавек (мясцовы настаўнік гісторыі, супрацоўнік музея ці проста апантаны краязнавец), які ўсё раскажа і пакажа з задавальненнем. Такіх людзей варта шукаць і слухаць, бо тое, што ведаюць яны, не паведаміць ні адна энцыклапедыя і нават дасведчаны экскурсавод са сталіцы.

Так што, калі задумалі — смела кіруйцеся ў Рагачоў ці любое іншае паселішча нашай краіны. Не слухайце тых, каго той жа Караткевіч здзекліва цытаваў: «Ах-ах, мандаліны! Ах-ах, мусоны! //А ў нас так нудна!». Калі ёсць імпэт і зацікаўленасць — абавязкова паўсюль знойдзеце адметную легенду ці быль нашай роднай зямлі.

...А ў Рагачове, калі затрымацца да ранніх ужо прыцемкаў, можна ўбачыць, як дзівосны яркі месяц плыве над чорнымі бліскучымі пераліваміі Дняпра, даганяючы сваё дрыготкае адлюстраванне на хвалях ракі. Акурат такі, пэўна, бачыла каралева Бона, калі Гервасій Выліваха паказваў ёй свет за сценамі палаца...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА
по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.

Продавец: ОАО «Витебские продукты», 210041, г. Витебск, ул. Воинов-интернационалистов, 25, тел. +375 29 711-18-95.

Лот №1. Право на заключение договора аренды сроком на 3 года частей капитального строения (инв.№200/С-52276) площадью 22,4 кв.м на 1 этаже по адресу: г. Витебск, ул. Лазо, 8 (здание магазина). Размер ежемесячной арендной платы: 16,13 базовой арендной величины. **Целевое использование:** объект по оказанию услуг населению (кроме ритуальных услуг), офиса, объекта торговли непродовольственными товарами (в т.ч. аптеки). **Нач. цена (с учетом/до деноминации):** 76,16/761 600 бел. руб. **Задаток (с учетом/до деноминации):** 7,62/76 200 бел. руб.

Лот №2. Право на заключение договора аренды сроком на 3 года частей капитального строения (инв.№200/С-52276) площадью 41,7 кв.м на 1 этаже по адресу: г. Витебск, ул. Лазо, 8 (здание магазина). Размер ежемесячной арендной платы: 30,02 базовой арендной величины. **Целевое использование:** объект по оказанию услуг населению (кроме ритуальных услуг), офиса, объекта торговли непродовольственными товарами (в т.ч. аптеки). **Нач. цена (с учетом/до деноминации):** 141,78/1 417 800 бел. руб. **Задаток (с учетом/до деноминации):** 14,20/142 000 бел. руб.

**Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 08.09.2016 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 19.08.2016 с 8.30 по 07.09.2016 до 17.30. Ранее опубликованное извещение о проведении аукциона: газета «Звязда» 28.07.2016.

**Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукционы проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08 2009 №1049. Юридические, физические лица, индивидуальные предприниматели обязаны подать организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы, предоставить: копию платежного документа о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона; юр.лицом – резидентом РБ: копию документа, подтверждающую гос.регистрацию юр.лица; юр.лицом – нерезидентом РБ: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; индивидуальным предпринимателем: копию документа, подтверждающего гос.регистрацию индивидуального предпринимателя. При подаче заявления на участие в аукционе предъявляется документ, удостоверяющий личность; представителями – оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица). Победитель аукциона – лицо, предложившее самую высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к Победителю аукциона) обязан оплатить предмет аукциона, затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; заключить договор аренды недвижимого имущества не позднее 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. В случаях если Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) не подписал протокол аукциона; не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона; не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона; не подписал договор аренды, а также в случае если участники аукциона отказались объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным, указанными лицами уплачивается штраф в размере 100 базовых величин. Сумма задатка перечисляется на р/с организатора аукциона: №3012078870010 ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», БИК 153001117, г. Витебск, ул. Ленина, 17, УНП 390477566. Конт. тел: (0212) 42-61-62, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.

**Извещение о повторном открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Гроднопромтехника» 13 сентября 2016 года**

| | |
|---|---|
| **Вид аукциона** | Открытый |
| **Предмет аукциона** | Автозаправочная станция с инвентарным номером 400/С-5796 с принадлежностями (навес, резервуары стальные – 16 шт., асфальтобетонное, плиточное покрытие, ограждение, канализационная сеть, ливневая канализация, сеть наружного освещения, водопроводная сеть, линия электропередачи, технологический трубопровод, тепловая сеть) общей площадью 47,0 м², год ввода в эксплуатацию – 1989 |
| **Начальная цена продажи** | 183 178 рублей (с учетом НДС 20%) |
| **Кадастровый номер земельного участка** | 422000000009003026 |
| **Месторасположение земельного участка** | г. Гродно, ул. Понемуньская, д. 2Д |
| **Размер земельного участка** | 0,4581 га |
| **Продавец** | Открытое акционерное общество «Гроднопромтехника», 230003, г. Гродно, ул. Понемуньская, д. 20, тел. (0152) 757368, 757367 |
| **Организатор аукциона** | КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», тел. 720537, 720546. |
| **Дата проведения аукциона** | 13 сентября 2016 года |
| **Время проведения аукциона** | 12.00 |
| **Место проведения аукциона** | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал |
| **Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов** | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 57 |
| **Дата и время начала приема документов** | 22 августа 2016 года 8.00 |
| **Дата и время окончания приема документов** | 7 сентября 2016 года 17.00 |
| **Сумма задатка** | 10 000 рублей |
| **Шаг аукциона** | 5 % |

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000041810 в филиале №400 ГОУ ОАО АСБ «Беларусбанк», код 752, УНП 590727594 получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости»; **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **Физическое лицо:** паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

